Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 16 (5390).
ПАНЯДЗЕЛАК
20
СТУДЗЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Гутарка таварышоў СТАЛІНА і МОЛАТАВА з аўтарамі опернага спектакля „Тихий Дон“

17 студзеня ў Маскве адбыўся апошні гастрольны спектакль ленінградскага дзяржаўнага акадэмічнага Малога опернага тэатра. У гэты дзень ішла опера І. Дзержынскага «Тихий Дон». На спектаклі прысутнічалі таварышы СТАЛІН і МОЛАТАЎ, а таксама сакратар ЦВК СССР тав. АКУЛАЎ і нарком асветы тав. БУБНОЎ. Пасля 3-га акта тт. Сталін і Молатаў гутарылі з аўтарамі спектакля—кампазітарам І. Дзержынскім, музычным кіраўніком тэатра дырыжэрам С. А. Самасуд і рэжысёрам А. А. Терэшковічам.

У часе гутаркі тт. Сталін і Молатаў далі станоўчую ацэнку работы тэатра ў галіне стварэння совецкай оперы, адзначылі значную ідэйна-палітычную каштоўнасць пастаноўкі оперы «Тихий Дон».

У заключэнне гутаркі тт. Сталін і Молатаў выказалі рад заўваг аб неабходнасці знішчыць паасобныя недахопы ў афармленні спектакля і выказалі ўсяму творчаму калектыву пажаданне далейшых поспехаў у рабоце над совецкай операй.

БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ ОРДЭНАНОСЦАМ!

Л. М. КАГАНОВІЧ

Г. К. ОРДЖАНІКІДЗЕ


А. І. МІКАЯН

І. Е. ЛЮБІМАЎ

С. С. ЛОБАЎ

А. Я. БАЛЦІН

Н. І. ПАХОМАЎ.

План стаханаўскага года

Другая сесія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР праходзіла ў пачатку чацвертага года другой пяцігодкі. Сесія праходзіла ва ўмовах, калі ўся краіна, паспяхова закончыўшы 1935 год, уступіла ў новы, стаханаўскі год.

Сесія падвяла вынікі 1935 года. Поспехі ў наяўнасці. Яны бліскучыя і велізарныя. Сесія намеціла задачы 1936 года. Яны грандыёзныя і велічныя.

Тры гады таму назад таварыш **Сталін** з мудрай празорлівасцю і пранікацельнасцю на студзеньскім пленуме ЦК ВКП(б) гаварыў:

«У перыяд першай пяцігодкі мы здолелі арганізаваць энтузіязм, пафас **новага будаўніцтва** і дабіліся рашаючых поспехаў. Гэта вельмі добра. Але цяпер гэтага недастаткова. Цяпер гэту справу павінны мы дапоўніць энтузіязмам, пафасам **асваення** новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным узнятнем прадукцыйнасці працы, сур'ёзным скарачэннем сабекошту.

У гэтым цяпер галоўнае.

Бо толькі на гэтай базе мы можам дабіцца таго, каб, скажам, к другой палове другой пяцігодкі ўзяць новы магутны разбег як у галіне будаўніцтва, так і ў галіне прыросту прамысловай прадукцыі».

Гэта геніяльнае прадбачанне поўнасцю стала ажыццяўляцца якраз з паловы другой пяцігодкі. Магутны стаханаўскі рух разліўся па ўсёй краіне, ахапіў усе галіны вытворчасці. Да нябачаных раней размераў узнялася прадукцыйнасць працы. Яна вырасла, як ясна ўказваў таварыш Сталін, з асваення новай тэхнікі. Яна забяспечыла поўнае выкананне і перавыкананне вытворчай праграмы 1935 года.

Перамогі социялістычнай гаспадаркі адзначаліся ва ўсіх дакладах на сесіі. Гэтыя перамогі адзначаны ўрадам Саюза ССР, які ўзнагарадзіў ордэнамі кіраўнікоў розных галін народнай гаспадаркі.

Узнагароджаны лепшы сталінец, буйнейшы арганізатар у нашай партыі нарком транспарту тав. **Кагановіч**, узнагароджаны слаўны камандарм цяжкай прамысловасці, выдатны арганізатар мас тав. **Орджанікідзе** і баявы кіраўнік і арганізатар харчовай прамысловасці тав. **Мікаян**, узнагароджаны забяспечыўшыя дасягнутыя поспехі ў справе аўладання вытворчасцю і аўладання тэхнікай наркомы тт. **Любімаў, Пахомаў, Лобаў, Уханаў, Сухамлінаў** і **Балцін**. Узнагароджаны нарком унутранога гандлю т. **Вейцэр** і старшыня Камітэта загатовак т. **Клейнер**. «Правда», падводзячы вынікі сесіі, піша аб узнагароджаных: «Гэта з'яўляецца прызнаннем вялікіх заслуг узнагароджаных таварышоў, а таксама і вялікіх поспехаў, дасягнутых рознымі галінамі народнай гаспадаркі».

Той факт, што сярод узнагароджаных знаходзіцца і народны камісар мясцовай прамысловасці БССР тав. Балцін А. Я., гаворыць аб тым, што прамысловасць Совецкай Беларусі пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і пры дапамозе ўсяго Совецкага Саюза, і, асабліва, рускага пролетарыята, дабілася значных поспехаў. Прамысловасць Совецкай Беларусі датэрмінова выканала план, забяспечыўшы высокую якасць выпускаемай прадукцыі.

У мінулым саломены і драўляны «Северо-Западный край», дзякуючы правільнаму правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, ператварыўся ў край фабрык і заводаў, у індустрыяльную квітнеючую Беларускую совецкую рэспубліку.

Ворагі беларускага народу контрраволюцыйныя нацдэмы прадракалі для Беларусі худасочную «мармяладную» вытворчасць і кулацка-хутарскую сельскую гаспадарку.

Большэвікі Совецкай Беларусі на чале з лепшым сталінцам тав. **Гікало**, разграміўшы контрраволюцыйных надцэмаў, вывелі БССР у рады перадавых рэспублік Совецкага Саюза. У сярэдзіне 1935 года рэспубліка за выдатную работу ў галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі атрымала **ордэн Леніна**. Апошняя пастанова ЦВК СССР аб узнагародзе ордэнам Леніна наркома мясцовай прамысловасці БССР сведчыць аб тым, што тэмпы работы пролетарыяту нашай рэспублікі ўзняліся, рэспубліка атрымала новыя поспехі. У новым стаханаўскім годзе гэтыя тэмпы будуць памножаны.

Сесія ЦВК СССР прыняла праграму для новага стаханаўскага года. На 27 процантаў павялічваецца народны даход. Уся прамысловасць павялічвае выпуск прадукцыі на 23 проц., а лёгкая і таго больш — на 29 процантаў. 8 мільярдаў рублёў асігнуецца на культурна-бытавое будаўніцтва. Даволі назваць гэтыя лічбы, каб стала ясна, як багацеем, заможнасцю, культурай і радасцю яшчэ больш расквітнее наша краіна і яе шчаслівы народ. На 130,6 проц. павялічваецца бюджэт Совецкай Беларусі ў адносінах да мінулага года.

Ні адна другая краіна ў свеце не мае такіх тэмпаў росту. Наадварот, у капіталістычных краінах увесь час ідзе зніжэнне асігнаванняў на школу і культуру. Там-жа — закат прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Там голад і жабрацтва, беспрацоўе і некультур'е. У фашысцкай Германіі варочаюцца да сярэдневякоўя. У фашысцкай Польшчы ўсё больш і больш у культ уводзіцца такое жыццё, якое было пры прыгоне.

З цяперашняй міжнароднай абстаноўкі, з факту ўзмацнення ваеннай небяспекі і шалёных узбраенняў імперыялістычных дзяржаў наша краіна робіць пэўны вывад. Таму з такім вялікім уздымам члены сесіі — выбраннікі совецкага народу—прынялі прапанову ўрада аб павелічэнні асігнаванняў на ўмацаванне абароны краіны і ўзмацненне рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. Совецкі народ не абмяжоўваецца толькі грашовымі асігнаваннямі на ўмацаванне Чырвонай арміі. Калі вораг паспрабуе сунуцца на нашы граніцы, совецкі народ грудзьмі стане на абарону Вялікай пролетарскай рэволюцыі.

З поўным правам ад усяго беларускага народу тав. **Ушакоў**, лётчык, камандзір Беларускай ваеннай акругі гаварыў: «Працоўныя Беларусі, дэманструючы штодзённай работай адданасць нашай социялістычнай радзіме, калі патрэбна будзе, як адзін, са зброяй у руках падымуцца на абарону сваёй краіны ад нападаючых капіталістычных дзяржаў».

Авацыямі, поўнымі цеплыні, энтузіязму і адданасці, віталі члены сесіі арганізатара социялістычных перамог, друга ўсіх народаў таварыша **Сталіна**. Работы сесіі закончаны. З такім-жа энтузіязмам працоўныя рынуцца ў бой за ажыццяўленне грандыёзных задач, намечаных сесіяй. І беларускі народ, у песным адзінстве з народамі ўсяго вялікага Совецкага Саюза, закасаўшы рукавы, возьмецца за ажыццяўленне вялікіх задач стаханаўскага года.

Ёсць для чаго працаваць і змагацца шчаслівому народу самай шчаслівай краіны. Узведзена велізарнейшая пабудова — социялізм. Зараз гэта велічная пабудова, аб якой вякамі марылі народы, упрыгожваецца, убіраецца ў квяцістае адзенне. Заможна і весела жывецца, работа ўсё больш і больш спорыцца.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

14—17 СТУДЗЕНЯ 1936 г. АДБЫЎСЯ ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б. ПЛЕНУМ РАЗГЛЕДЗЕЎ НАСТУПНЫЯ ПЫТАННІ:

1. ВЫНІКІ ПРАВЕРКІ ПАРТДАКУМЕНТАЎ ПА КП(б)Б.

2. АБ СТАНОВІШЧЫ ПРАПАГАНДЫ І АГІТАЦЫІ.

3. ПРАКТЫЧНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА РАЗГОРТВАННЮ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР У СУВЯЗІ З РАШЭННЯМІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б).

4. ОРГПЫТАННІ.

ПЛЕНУМ КААПТАВАЎ У ЧЛЕНЫ ЦК КП(б)Б І Ў СКЛАД ЧЛЕНАЎ БЮРО ЦК КП(б)Б ТАВ. **БУЛІНА** — НАЧАЛЬНІКА ПАЛІТКІРАЎНІЦТВА БВА, ЗАМЕСТ ТАВ. **СМІРНОВА**, ВЫБЫЎШАГА Ў ДРУГУЮ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ, І ЎВЕЎ У СКЛАД КАНДЫДАТАЎ У ЧЛЕНЫ БЮРО ЦК КП(б)Б тт. **ХАДАСЕВІЧА** — САКРАТАРА МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б **АРАБЕЯ** — ЗАГ. АДДЗЕЛАМ ШКОЛ І НАВУКІ ЦК КП(б)Б і **СУРТА** — НАРКОМА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БССР.

РАШЭННІ ПЛЕНУМА БУДУЦЬ АПУБЛІКАВАНЫ Ў ДРУКУ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ.

ЦК КП(б)Б.

НАРКОМУ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР ТАВ. БАЛЦІНУ А. Я.

ЦК КП(б)Б віншуе Вас з узнагародай ордэнам Леніна. Гэта ўзнагарода з'яўляецца высокай ацэнкай вашай работы як кіраўніка, так і ўсёй работы мясцовай прамысловасці БССР у 1935 годзе, данай саюзным урадам.

ЦК упэўнен, што Вы, як кіраўнік мясцовай прамысловасці БССР, а таксама і ўсе рабочыя, дырэктары прадпрыемстваў, спецыялісты мясцовай прамысловасці БССР і ў асаблівасці стаханаўцы — даб'юцца яшчэ больш поспехаў у выкананні баявых указанняў партыі і ўрада па мясцовай прамысловасці і па-большэвіцку разгорнуць і ўзначаляць стаханаўскі рух.

ЦК КП(б)Б.

ВЫВЕЗЦІ ГАРУЧАЕ З БАЗ

Кожны дзень набліжае нас да веснавой сяўбы. Брыгадзіры трактарных атрадаў, трактарысты, вадзіцелі сельскагаспадарчых машын, узброеныя лозунгам вялікага **Сталіна** аб уздыме ўраджайнасці, уключыліся ў паход за высокую прадукцыйнасць машын. Тысяча гектараў на трактар! Гэты заклік лепшых трактарыстаў БССР падхоплен ужо сотнямі трактарыстаў і брыгадзіраў.

Поспех высокай прадукцыйнасці машыны заключаецца не толькі ва ўменні кіраваць трактарам, але і ў бесперабойным забеспячэнні кожнага трактара гаручым. Адной з галоўных прычын нізкай прадукцыйнасці трактараў у мінулым годзе з'яўляюцца перабоі ў забеспячэнні гаручым.

Становішча вывазкі гаручага з нафтавых баз, са складаў гаворыць аб тым, што райкомы партыі, райвыканкомы, земаддзелы і МТС не ўлічылі памылак мінулага года.

БССР павінна атрымаць у студзені месяцы **1.950 тон гаручага**. За першую дэкаду студзеня выбраны **толькі 84 тоны**. Прычыны недавыбаркі гаручага заключаюцца ў тым, што базы Нафтаснабзбыта і склады Белкаапсаюза перагружаны, а прымацаваныя да гэтых апорных пунктаў МТС і соўгасы не вывозяць адпушчанае ім гаручае. Горш за ўсё вывозіцца гаручае з **віцебскай, полацкай, рагачоўскай і слуцкай** нафтавых баз. **Смалявіцкая** МТС не падрыхтавала да веснавой сяўбы ні адной тоны гаручага.

Матэрыял, які мы сёння змяшчаем, сведчыць аб тым, што ў раёнах па гэты дзень нічога канкрэтнага не зрабілі для вывазкі гаручага з баз і складаў. Многія МТС прабуюць спасылацца на адсутнасць тары і патрэбных сродкаў для закупкі гаручага. Між тым, запазычанасць калгасаў МТС за праробленую работу складае мільёны рублёў. Наяўную тару не загружаюць. Цэлыя тыдні праходзяць на бюракратычную перапіску паміж МТС, Наркамземам, Нафтаснабзбытам аб водпуску тары і сродкаў. Даволі сказаць, што **Слуцкай** і **Асіпавіцкай** МТС яшчэ не спушчаны нарады на атрыманне гаручага. Гэтай бюракратычнай пяганіне і бяздзейнасці павінен быць пакладзен канец і неадкладна.

Канкрэтная дапамога павінна быць аказана раёнам глыбінных пунктаў, якія знаходзяцца на далёкай адлегласці ад чыгункі. Трэба неадкладна мабілізаваць дадатковы транспарт і рабочую сілу, каб глыбінныя пункты змаглі ў 2—3 дні поўнасцю вывезці адпушчанае ім гаручае.

План наліву БССР зацверджан у лютым месяцы ў 5.500 тон і калі зараз-жа раёны не пачнуць узмоцнена вывозіць з нафтаскладаў гаручае, мы можам быць пазбаўлены магчымасці атрымаць належачую нам колькасць гаручага па плану. А гэта значыць аказацца пад яўнай пагрозай зрыву нармальнай работы трактарнага парку.

Сакратары райкомаў, старшыні райвыканкомаў, загадчыкі земаддзелаў, дырэктары МТС нясуць **асабістую адказнасць** за поўную і неадкладную вывазку гаручага з нафтавых баз.

Цэнтральны Камітэт партыі будзе штодзенна правяраць рэалізацыю баявога загаду партыі — поўнай вывазкі гаручага з нафтаскладаў у кожным раёне. Іменна на гэтым адказнейшым участку падрыхтоўкі да веснавой сяўбы будзе правяраца здольнасць кожнага сакратара райкома, кожнага старшыні райвыканкома змагацца за сталінскі ўраджай.

ПАСТАНОВА 2-й СЕСІІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР VII СКЛІКАННЯ

АБ АДЗІНЫМ ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ САЮЗА ССР НА 1936 ГОД

Разгледзеўшы прадстаўлены Советам Народных Камісараў Саюза ССР праект адзінага дзяржаўнага бюджэту Саюза ССР на 1936 г. і заключэнне па ім Бюджэтнай Камісіі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР **пастанаўляе:**

1. Зацвердзіць звод даходаў і расходаў адзінага дзяржаўнага бюджэту Саюза ССР на 1936 год са зменамі, прапанаванымі Бюджэтнай Камісіяй у наступных сумах **(у тыс. руб.)**.

Па даходах

А. ДАХОДЫ АГРАМАДЖАНАЙ ГАСПАДАРКІ

1. Падатак з абароту		62.690.000
У тым ліку: хлебапрадукты	21.200.000	
спірт	6.000.000	
раслінае масла	2.660.000	
цукар	5.900.000	
мяса	3.025.000	
баваўнянка	4.200.000	
нафта	4.670.000	
2. Адлічэнні ад прыбыткаў:		
а) прамысловасць НКЦяжпрома		873.600
б) прамысловасць НКЛегпрома		370.000
в) прамысловасць НКХарчпрома		868.800
г) прамысловасць НКЛеса		13.000
д) прамысловасць НКМясцпромаў		94.424
е) кіно-фото-прамысловасць		2.600
ж) дзяржаўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы		17.531
з) чыгуначны транспарт		100.000
і) іншыя віды транспарту		12.300
к) народная сувязь		1.200
л) дзяржаўныя, гандлёвыя і загатоўчыя прадпрыемствы		45.860
м) прадпрыемствы НКЗамежнага гандлю		45.100
н) дзяржаўныя крэдытныя ўстановы		423.900
о) органы дзяржаўнага страхавання		220.000
п) іншыя плацельшчыкі		99 995
Усяго адлічэнняў ад прыбыткаў		3.188.310
3. Падаходны падатак і іншыя падаткі з прадпрыемстваў і арганізацый:		
а) падаходны падатак з каперацыйных арганізацый		48.985
б) падатак з нетаварных аперацый		260.370
в) сельскагаспадарчы падатак з калгасаў		449.950
г) падатак з соўгасаў		39.215
Усяго падаткаў з прадпрыемстваў і арганізацый		798.520
4. Паступленні са сродкаў дзяржаўнага социяльнага страхавання на социяльна-культурныя мерапрыемствы		3.150.000
5. Ад змяшчэння вольных сродкаў гаспадарчых і крэдытных арганізацый у дзяржаўныя пазыкі:		
а) па дзяржаўнаму страхаванню		400.000
б) па ашчадных касах		800.000
Усяго па дзяржаўных пазыках		1.200.000
6. Іншыя даходы аграмаджанай гаспадаркі		92.000
Усяго па аграмаджанай гаспадарцы		71.118.830

Б. ДАХОДЫ АД ПАЗЫК, ПАДАТКАЎ І ЗБОРАЎ

1. Ад рэалізацыі дзяржаўных пазык сярод насельніцтва		3.950.000
2. Падаткі і зборы:		
а) сельскагаспадарчы падатак з калгаснікаў і аднаасобных сялянскіх гаспадарак		650.080
б) збор на патрэбы жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў гарадах		950.000
в) збор на патрэбы жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў сельскіх мясцовасцях		530.000
Усяго падаткаў і збораў		2.130.080
Усяго па пазыках, падатках і зборах		6.080.080

В. ІНШЫЯ ДАХОДЫ

1. Мытныя даходы		820.000
2. Манетны даход		20.000
3. Розныя даходы		676.118
Усяго іншых даходаў		1.516.118
РАЗАМ		78.715.028

Па расходах

А. НАРОДНАЯ ГАСПАДАРКА

1. Прамысловасць НКЦяжпрома	10.160.800
2. Прамысловасць НКЛегпрома	910.100
3. Прамысловасць НКЛеса	1.372.100
4. Прамысловасць НКХарчпрома	942.200
5. Прамысловасць НКМясцпромаў	428.730
6. Кіно-фото-прамысловасць	262.180
Усяго па прамысловасці	14.076.110
7. Сельская гаспадарка, падведамственая НКСоўгасаў	1.825.200
8. Сельская гаспадарка, падведамственая НКЗему	5.875.491
Усяго па сельскай гаспадарцы	7.700.691
9. Народны Камісарыят Шляхоў Зносін	4.212.400
10. Народны Камісарыят Воднага Транспарту	1.433.700
11. Галоўнае Кіраўніцтва Паўночнага Морскага Шляху	439.700
12. Кіраўніцтва дарожнай гаспадаркай НКУС	950.200
13 Галоўнае Кіраўніцтва Грамадзянскага Паветранага Флота	288.950
14 Народны Камісарыят Сувязі	360.000
15 Волгабуд	222.500
Усяго па транспарту і сувязі	7.907.450
16 Дзяржаўны гандаль, снабжэнне і загатоўчыя арганізацыі	1.413.060
17. Народны Камісарыят Замежнага Гандлю	52.500
18. Камітэт рэзерваў пры СПА	1.592.500
19. Маскоўскі Метрапалітэн	311.500
20. Адзіная гідраметэаралагічная служба СССР	68 960
21. Іншыя расходы па народнай гаспадарцы	1.430 790
Усяго на народную гаспадарку	37.583.501

Б. СОЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

1. Асвета.	
З агульнай сумы расходаў па дзяржаўнаму і мясцовых бюджэтах і па бюджэту социяльнага страхавання	12.120,9 м. р.
асігнаваць па адзінаму дзяржаўнаму бюджэту	4.918.073
2. Ахова здароўя.	
З агульнай сумы расходаў па дзяржаўнаму і мясцовых бюджэтах і па бюджэту социяльнага страхавання	6.214,5 м. р. асігнаваць па адзінаму дзяржаўнаму бюджэту 1.472.191
3 Фізічная культура.	
З агульнай сумы расходаў па дзяржаўнаму і мясцовых бюджэтах і па бюджэту социяльнага страхавання	76,8 м. р. асігнаваць па адзінаму дзяржаўнаму бюджэту 29.188
4. Социяльнае забеспячэнне і ахова працы.	
З агульнай сумы расходаў па дзяржаўнаму і мясцовых бюджэтах і па бюджэту социяльнага страхавання	2.879,3 м. р.
асігнаваць па адзінаму дзяржаўнаму бюджэту	90.018
Усяго па социяльна-культурных мерапрыемствах:	
З агульнай сумы расходаў па дзяржаўнаму і мясцовых бюджэтах і па бюджэту социяльнага страхавання	21.291,5 м. р.
асігнаваць па адзінаму дзяржаўнаму бюджэту	6.509.470
В. Народны Камісарыят Абароны Саюза ССР	14.815.500
Г. Народны Камісарыят Унутраных Спраў	2.110.900
Д. Расходы па кіраванню	970.902
Е. Расходы па дзяржаўных пазыках	2.701.529
Ж. Разлікі з банкамі доўгатэрміновых укладанняў	265.000
З. Рэзервовыя фонды СНК СССР і СНК СР—к	857.200
І. Іншыя расходы	444.542
К. Сродкі, перадаваемыя ў мясцовыя бюджэты	12.456.484
У тым ліку сродкі дзяржаўнага социяльнага страхавання на социяльна-культурныя мерапрыемствы	2.190.700
Усяго	78.715.028

(ПРАЦЯГ ПАСТАНОВЫ НА 4 СТАР.)

НАПЯРЭДАДНІ ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ ВЫДАТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

25 студзеня ў Менску склікаецца ўсебеларуская нарада выдатнікаў сельскай гаспадаркі.

22 студзеня чакаецца прыбыцце дэлегатаў з **Дзяржынскага, Заслаўскага, Плешчаніцкага, Лагойскага, Смалявіцкага, Пухавіцкага, Смілавіцкага, Чэрвеньскага, Уздзенскага, Бабруйскага, Рагачоўскага, Кіраўскага, Асіпавіцкага, Бярэзінскага, Круглянскага і Бялыніцкага** раёнаў.

ВЫНІКІ СНЕЖАНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)

*Даклад тав. А. А. ЖДАНАВА на сходзе ленінградскага партыйнага актыва 30 снежня 1935 г. *)*

Таварышы! Снежаньскі пленум ЦК ВКП(б) правільна быў ахарактарызаваны ў нашым друку, як пленум умацавання социялістычных асноў і большэвіцкіх прынцыпаў у нашай краіне, як пленум, які з велізарнай сілай прадэманстраваў найвялікшую сувязь, давер'е, любоў і павагу, якімі карыстаецца наша партыя з боку ўсяго народу.

На пленуме прымала ўдзел да трох тысяч гаспадарчых і партыйных работнікаў, інжынераў і стаханаўцаў рабочых. Гэта лішні раз падкрэслівае тое першаступеннае значэнне, якое ЦК падае пытанням, якія абмяркоўваліся на пленуме.

Рашэнні пленума ЦК і асноўныя дакументы — даклады па першаму пытанню парадку дня, а таксама выступленні тт. Саркісава і Андрэева апублікаваны. Гэта аблягчае мне задачу, даючы магчымасць не прыводзіць у сваім дакладзе вялікай колькасці даных, якія датычаць фактычнага становішча справы.

У парадку дня пленума стаялі два важнейшыя пытанні нашага социялістычнага будаўніцтва: пытанне аб задачах прамысловасці і транспарту ў сувязі са стаханаўскім рухам і пытанне аб выніках праверкі партыйных дакументаў.

I. Стаханаўскі рух і нашы задачы

ВЫТОКІ І ЗНАЧЭННЕ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ

Таварышы, стаханаўскі рух — гэта найвялікшы рух народных мас нашай краіны, якому дан вычарпальны, бліскучы аналіз у гістарычнай прамове на нарадзе стаханаўцаў нашым правадыром і настаўнікам таварышам Сталіным. Гэты рух прамым чынам звязан з поспехамі 1935 г.

1935 г. — асаблівы год. Ён увойдзе ў гісторыю нашых перамог, як год самых буйных, самых выдатных поспехаў. Буйнейшай падзеяй 1935 года з'яўляецца стаханаўскі рух — самы бліскучы, яркі ўклад у скарбніцу нашых социялістычных заваяванняў.

Стаханаўскі рух узнік на аснове канчатковай перамогі социялізма ў нашай краіне, перамог індустрыялізацыі СССР і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, росту крадраў, авалодваючых новай тэхнікай, на аснове таго, што жыццё працоўных Совецкага Саюза стала лепш, весялей і з кожным днём будзе станавіцца ўсё больш і больш яркім, поўнацэнным, заможным і шчаслівым.

Для таго, каб разгарнуўся стаханаўскі рух, трэба было пабудаваць буйную індустрыю, трэба было калектывізаваць сельскую гаспадарку, трэба было ў корані змяніць адносіны да працы. Трэба было працу з падняволнага ярма, якою яна з'яўлялася і з'яўляецца пры капіталізме, ператварыць у справу доблесці, славы і геройства. Нам удалося зрабіць гэта, і няма ні адной краіны ў свеце, дзе-б праца была ўзнята на такую вышыню, на якую яна ўзнята ў нас, у краіне перамогшага социялізма. Трэба было забяспечыць стваранне і асваенне новай тэхнікі. Трэба было, каб з'явіліся ў нас і пачалі быстра расці кадры, аўладаўшыя новай тэхнікай. Усе гэтыя ўмовы і прывялі да таго, што ў 1935 годзе ў нас буйным цветам расцвіў стаханаўскі рух.

Аб значэнні стаханаўскага руху вычарпальныя словы сказаны таварышам Сталіным. Ён гаварыў, што «стаханаўскі рух нельга разглядаць, як звычайны рух рабочых і работніц. Стаханаўскі рух гэта такі рух рабочых і работніц, які ўвойдзе ў гісторыю нашага социялістычнага будаўніцтва, як адна з самых слаўных яе старонак».

Значэнне стаханаўскага руху, як аб гэтым гаварыў таварыш Сталін, заключаецца ў тым, што ён стварае ўзоры высокай прадукцыйнасці працы і паказвае, што социялізм стварае больш высокую прадукцыйнасць працы, чым капіталізм. А пытанне аб прадукцыйнасці працы, як вучыў Ленін,—у канчатковым ліку ёсць самае галоўнае, самае рашаючае для пабудовы комуністычнага грамадства.

Значэнне стаханаўскага руху заключаецца, далей, у тым, як указваў таварыш Сталін, што ён з'яўляецца глыбока рэволюцыйным па зместу, ён ламае старыя нормы, старыя тэхнічныя праектныя магутнасці і вытворчыя планы і тым самым ламае старыя погляды на тэхніку, наносіць рашучы ўдар усякай адсталасці, усякаму кансерватызму ў вытворчасці, у тэхніцы.

У нас ёсць людзі, якія прабуюць прынізіць і апашліць стаханаўскі рух, абмяжоўваючы яго задачы дзяляцкімі патрэбнасцямі сёнешняга дня. У нас ёсць такія гаспадарчыя і партыйныя работнікі, якія лічаць, што стаханаўскі рух неабходны пастолькі, паколькі не выконваецца промфінплан і стаханаўцы дапамагаюць яго выканаць. Гэта правільна, вядома, што стаханаўцы дапамаглі многім нашым гаспадарчым, партыйным і профсаюзным работнікам выканаць і перавыканаць план. Правільна і тое, што стаханаўцы многім і, на жаль, яшчэ не ўсім з нашых інжынераў, тэхнікаў і гаспадарнікаў адкрылі вочы на велізарныя рэзервы, якія тоцца ў нашай тэхніцы, якія знаходзіліся да гэтага часу пад спудам.

Але значэнне стаханаўскага руху гэтым не вычэрпваецца. Толькі ліквідаваўшы такія апартуністычна-дзяляцкія погляды на задачы і перспектывы стаханаўскага руху, можна падняцца да разумення яго вялікага значэння. Ён, стаханаўскі рух, носіць у сабе, як гаворыць таварыш Сталін, зёрны будучага комуністычнага грамадства, паколькі ён прадстаўляе сабой пачаткі такога культурна-тэхнічнага ўзыму рабочага класа нашай краіны, на аснове якога будзе дасягнута ліквідацыя процілегласці паміж разумовай і фізічнай працай. Стаханаўскі рух «падрыхтоўвае ўмовы для пераходу ад социялізма да комунізма» (Сталін).

Стаханаўцы з'яўляюцца праобразам, прататыпам людзей будучага. Стаханаўцы — гэта новыя людзі, і з гэтага пункту гледжання стаханаўскі рух з'яўляецца вялізарна важным. Таварыш Сталін з геніяльнай празорлівасцю і праніцальнасцю правадыра звязаў усе асноўныя практычныя задачы руху з яго вялікай перспектывай, асвятліўшы як пражэктарам шлях нашай барацьбы за комунізм. Ён падкрэсліў усё значэнне стаханаўскага руху для падрыхтоўкі пераходу ад социялізма да комунізма, дзе не будзе супярэчнасці паміж разумовай і фізічнай працай, дзе будзе праведзен у жыццё асноўны прынцып комуністычнага грамадства: «Ад кожнага па здольнасцях—кожнаму па патрэбнасцях».

Стаханаўскі рух мог вырасці на базе магутнага росту тэхнікі ў нашай краіне, і ў першую чаргу на базе росту цяжкай прамысловасці. Таварыш Серго ў сваім дакладзе на пленуме (гэты даклад апублікован) прывёў яркія і пераканаўчыя лічбы, якія паказваюць, як нам удалося зламаўшы супраціўленне ўсіх ворагаў унутры і па-за краінай, разграміўшы апартуністаў правых і «левых», адпрацаваўшы ўсе прадраканні буржуазных эканамістаў адносна немагчымасці пабудаваць новае грамадства, ажыццёвіць на справе тую лінію на ператварэнне старой, адсталай Расіі ў перадавую індустрыяльна-социялістычную краіну, незалежную ад капіталістычных дзяржаў, якая была абвешчана Леніным у генеральным плане ГОЭЛРО і якая была развіта таварышам Сталіным 10 год назад, на XIV з'ездзе нашай партыі.

Прайшоўшыя гады першай і другой пяцігодак былі гадамі бліскучага пацвярджэння, бліскучага ператварэння ў жыццё гэтых ленінска-сталінскіх ідэй.

Вы памятаеце, што па плану ГОЭЛРО, па ленінскаму плану ператварэння нашай краіны ў перадавую індустрыяльную краіну, у краіну буйнай індустрыі, здабыча вугалю меркавалася ў 62 млн. тон. У 1935 г. мы будзем мець 108 млн. тон вугалю па меншай меры. Значыцца, план ГОЭЛРО ў адносінах вугалю выканан на 174 процанты.

Таксама абстаіць справа і са здабычай торфу, дзе першапачатковыя намячэнні плана ГОЭЛРО значна перавыкананы.

А вы памятаеце, якое значэнне Владзімір Ільіч надаваў тарфяной прамысловасці, як ён клапаціўся аб гідраторфе, калі ён указваў, што калі-б нам удалося развіць здабычу мясковага апалу, і ў прыватнасці торфу, то мы вельмі быстра рушыліся-б наперад у справе падвядзення пад нашу прамысловасць моцнай апалавай базы.

Таксама абстаіць справа са здабычай жалезнай руды, дзе намячэнне плана ГОЭЛРО перавыкана амаль на 50 проц., з выплаўкай чугуну, сталі. Калі параўнаць вынікі 1935 года з 1925 годам, калі адбываўся XIV з'езд партыі, мы атрымаем такія даныя:

Электраэнергіі ў снежні 1925 г. мы выпрацоўвалі 3 млн. квт.; у другой дэкадзе снежня 1935 г. — 58 млн. квт., г. зн. за 10 год вытворчасць электраэнергіі ў нашай краіне вырасла ў 17 раз.

Каменнага вугалю ў снежні 1925 г. мы здабывалі ў суткі 67 тыс. тон; у другой дэкадзе снежня 1935 г. штосутачна — 360 тысяч тон, ці ў 5½ раза больш. Такі-ж малюнак па нафце, коксу. Па жалезнай рудзе малюнак яшчэ больш здзіўляючы: у 1925 г. за дэкаду здабывалася 8 тыс. тон, у 1935 годзе — 90 тыс. тон; сернай кіслаты здабывалі ў 1925 г. 400 тон у дэкаду, а ў 1935 г.—3.183 тоны, гэта значыць павелічэнне амаль у 8 раз; здабыча суперфасфату павялічылася ў 14 раз.

Асабліва яркія паказальнікі мы бачым у машынабудаўніцтве. У галіне машынабудаўніцтва мы пачалі амаль ад нуля. Машынабудаўнічых заводаў амаль не было ў нашай краіне. Мы не мелі ні аўтатрактарабудаўніцтва, ні авіябудаўніцтва, ні цэлага раду іншых важнейшых галін машынабудаўніцтва. Яны створаны нанава ў нашай краіне. Калі ў 1925 г. грузавых аўтамабіляў мы выраблялі 7 штук у месяц, то ў кастрычніку 1935 г. мы іх выраблялі 7.000, г. зн. у тысячу раз больш. Легкавых аўтамабіляў у 1925 г. зусім не выраблялі, а ў кастрычніку 1935 г. мы выраблялі 7.756 «фордаў», у кастрычніку—снежні 1936 г. мы павінны будзем выраблць ужо не адкрытыя «форды», а «б'юікі» і форды-лімузіны. Відавочна, праз год, а можа быць і раней, нашы актывісты будуць прыязджаць на актывы ўжо не на цяперашніх «фордах», а на фордах-лімузінах і совецкіх «б'юіках». (Апладысменты).

І калі 10 год назад у сусветнай вытворчасці электраэнергіі мы займалі 11 месца, то ў 1935 годзе мы займаем трацяе месца ў свеце; па каменнаму вугалю ў 1925 г. мелі 10 месца ў свеце, а ў 1935 годзе — чацвертае.

Па вытворчасці чыгуну мы былі ў 1925 годзе на 7 месцы ў свеце, цяпер выйшлі на 2 месца. Па сталі былі на 6 месцы, выйшлі на 3. Трактараў наогул ў 1925 годзе не выраблялі, а цяпер выйшлі на першае месца ў свеце. Па грузавых аўтамабілях былі на 11 месцы, выйшлі на другое месца ў свеце.

Як бачыце, у мінімальныя гістарычныя тэрміны мы выканалі план індустрыялізацыі нашай краіны, задуманы Леніным і ажыццёўлены Сталіным. (Бурныя апладысменты).

За гэтыя гады адбываліся ўзмоцненае будаўніцтва новых заводаў і рэканструкцыя старых прадпрыемстваў.

Тав. Орджанікідзе на пленуме ЦК назваў выдатныя даныя, характарызуючыя карэнную змену твару нашых старых заводаў. Ён прывёў, як адзін з тыповых прыкладаў, завод «Динамо», які за мінулыя гады ў сувязі з тэхнічнай рэканструкцыяй да непазнаванасці змяніў свой твар, павялічыўшы свой асноўны капітал за дзесяць год больш чым у 4 з паловай раза. Тав. Кіраў не раз гаварыў, што заводы Ленінграда захавалі ад старога толькі слаўныя большэвіцкія традыцыі, абнавіўшы ў корані ўсё абсталяванне, усю тэхніку. У пацвярджэнне гэтых мыслей тав. Кірава я прыведу рэкордныя даныя па ленінградскіх фабрыках і заводах. Яны, гэтыя даныя, паказваюць, што Сергей Міронавіч быў абсалютна праў, калі гаварыў аб тым, што сучасныя ленінградскія прадпрыемствы зусім не падобны на ранейшыя прадпрыемствы.

Вазьміце Кіраўскі завод. У 1925 г. вытворчыя фонды Кіраўскага завода складалі 59 млн. рублёў, а ў 1935 г. — ужо 146 млн. Рост больш чым у 2½ раза. Валавая прадукцыя Кіраўскага завода ў 1925 г. складала 20 млн., а ў 1935 г. — 234 млн. рублёў. Рост у 11½ раз. Лік рабочых у 1925 годзе быў 7.700, у 1935 г. — 20 тыс. чалавек.

Вось другі прыклад — завод «Электросила». Асноўныя вытворчыя фонды завода ў 1925 годзе складалі 8 млн. рублёў, а ў 1935 годзе — 38 млн. рублёў. Валавая прадукцыя адпаведна — 8 млн. рублёў і 125 млн. рублёў. Рост у 16 раз.

Вазьміце іншыя заводы — «Светлану», «Пневматику», Іжорскі, імя Казіцкага — і на гэтых заводах такое-ж становішча.

Наша цяжкая прамысловасць ішла наперадзе астатніх галін народнай гаспадаркі, бо яна павінна была пераўзбройваць і ўсе іншыя галіны прамысловасці, і транспарт, і сельскую гаспадарку. Без трактараў і камбайнаў нельга было стварыць і ўмацаваць буйную социялістычную сельскую гаспадарку — калгасы і соўгасы. Без уздыму цяжкай прамысловасці нельга было паставіць на ногі транспарт, лёгкую, лясную і харчовую прамысловасць. Цяжкая прамысловасць —прадмет асаблівых клопатаў Леніна і Сталіна, нашай большэвіцкай партыі — дапамагла пераўзброіць усе астатнія галіны народнай гаспадаркі — транспарт, сельскую гаспадарку, лясную, лёгкую і харчовую індустрыю. У гэтым уздыме цяжкай прамысловасці выключную ролю адыграў слаўны камандарм яе таварыш Серго Орджанікідзе. (Доўгія апладысменты).

Створана нанава магутная і механізаваная лясная прамысловасць на месцы дробных саматужных лесапільных заводаў, якія дасталіся нам ад старога рэжыму, на месцы лясных распрацовак, якія вяліся ў мінулым капіталістамі шляхам прымянення ручной працы, без усякай механізацыі, па-варварску.

Нанава створана і паспяхова ідзе наперад харчовая прамысловасць.

Калі ўзяць ленінградскія прадпрыемствы Наркамата харчовай прамысловасці — Мясакамбінат, Малочны камбінат, — яны прадстаўляюць перадавыя прамысловыя прадпрыемствы. Кандзіцерскіх і табачных фабрык у Ленінградзе колькасна цяпер менш, чым мы мелі ў пачатку першай пяцігодкі, аднак іх прадукцыя і тэхнічная ўзброенасць нязмерна вышэй, чым 10 год назад, не гаворачы ўжо аб дарэволюцыйным часе.

Такое-ж становішча ва ўсіх астатніх галінах народнай гаспадаркі.

Быстра ідзе ўгару чыгуначны транспарт. Штосутачная нагрузка дасягнула зараз 75.000 вагонаў і больш. Яшчэ год таму назад гэта лічба здавалася недасяжнай заскарузлым кансерватарам і бюракратам «прэдзельшчыкам» з апарата НКШЗ.

У красавіку 1935 года новае кіраўніцтва НКШЗ нанесла сакрушальны ўдар па ідэолагах тэорыі і практыкі «прэдзелаў», недавыкарыстання нашай транспартнай тэхнікі, па прапаведніках ілжэвучэння аб тым, што з нашага двухвоснага таварнага вагона, з гэтай «каробачкі», ужо няма чаго больш выціснуць. Гэтыя тэорыі былі апракінуты практыкай прайшоўшага года. Чыгуначнікі з гонарам выканалі свае абавязкі перад краінай. Большэвіцкая напорыстасць, арганізаванасць і воля да перамогі, выдатныя якасці, якія прывівае армії чыгуначнікаў слаўны нарком тав. Кагановіч, несумненна забяспечаць пры дапамозе ўсіх партыйных арганізацый выкананне задачы, пастаўленай перад чыгуначнікамі — грузіць 80.000 вагонаў у суткі. (Апладысменты).

Усе ўмовы да гэтага ў наяўнасці. Паляпшэнне работы чыгуначнага транспарту, дасягнутае за апошнія месяцы, настолькі вялікае, што НКШЗ мае цяпер 1.500 паравозаў у рэзерве. Яшчэ ніколі не было, каб чыгуначны транспарт не толькі выконваў планы перавозак, але і мог зэканоміць 1.500 паравозаў! НКШЗ мае цяпер магчымасць выбраць з усіх тыпаў паравозаў, якія мы выробляем, і пусціць у эксплаатацыю найбольш эканомныя, найбольш тэхнічна дасканалыя тыпы, такія, як «ФД», як «ИС» і новыя паравозы з выкарыстаннем адпрацаванай пары.

На аснове гэтых бліскучых перамог у справе стварэння і аўладання новай тэхнікай узнік і развіўся ў нашай краіне стаханаўскі рух. Таварыш Сталін быў абсалютна праў, калі ўказваў на тое, што для развіцця стаханаўскага руху недастаткова было адной наяўнасці новай тэхнікі. Ён, стаханаўскі рух, стаў магчымым таму, што з'явіліся і вырасліў нас **кадры, аўладаўшыя тэхнікай.** Вядома, што найбольшая колькасць стаханаўцаў у нас вышла з людзей, якія бліскуча аўладалі тэхнікай сваёй справы і паспяхова, на «выдатна» або на «добра» здалі тэхнічны мінімум. Па Ленінграду з 100 стаханаўцаў 85 здалі дзяржтэхэкзамен на «выдатна» і «добра». Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што стаханаўскі рух вырас сярод людзей, дасканала аўладаўшых тэхнікай сваёй справы. Задача заключаецца ў тым, каб у бліжэйшы год-два ахапіць тэхнічнай вучобай усіх рабочых.

У капіталістычных краінах нічога падобнага на стаханаўскі рух няма і быць не можа. Стаханаўскі рух ніколі не можа ўзнікнуць у краінах, дзе панаве буржуазія, бо рух за павышэнне прадукцыйнасці працы немінуча пацягнуў-бы там за сабой пагоршанне становішча рабочых, памяншэнне заработнай платы, павелічэнне беспрацоўя. Толькі ва ўмовах совецкага ладу, ва ўмовах адсутнасці эксплаатацыі, ва ўмовах социялізма магчымы стаханаўскі рух.

Ва ўмовах нашага ладу такі рух вядзе да росту прадукцыйнасці, да паляпшэння матэрыяльнага становішча рабочых, да павелічэння колькасці рабочых, да расшырэння фронта вытворчасці. Магчымасць паяўлення беспрацоўя ў нас абсалютна выключана, бо ў нас стаханаўскі рух непарыўна звязан з расшырэннем вытворчасці, з ростам патрэбнасцей працоўных, з ростам заможнасці і культурнасці. У нашай гаспадарцы, якая вядзецца па плану, не могуць мець месца крызісы перавытворчасці, патрасаючыя да асновы капіталістычныя краіны.

Нядаўна ў Цэнтральным Камітэце адбывалася вельмі важная нарада па пытаннях патанення і паляпшэння будаўніцтва. Абмяркоўвалася пытанне аб тым, як найбольш рацыянальна, найбольш арганізавана і эфектыўна выкарыстаць велізарны аб'ём капіталаўкладанняў, які намечан партыяй і ўрадам на 1936 год. План капітальных работ у 1936 годзе выражаецца ў грандыёзнай суме — 32 мільярды рублёў. Такога аб'ёму капітальных работ ніколі не ведала наша краіна. Адна гэта лічба паказвае, што ў нас зусім выключана магчымасць памяншэння ліку занятых рабочых.

Буржуазныя эканамісты і журналісты з усіх сіл прабуюць узвесці паклёп на стаханаўскі рух. Гэта зусім не навіна для нас. Бо яны прабавалі ўзвесці паклёп і на першую і другую пяцігодкі. Вядома, што атрымалася з гэтага паклёпу. Цяпер ужо ніхто не адважваецца адмаўляць нашых поспехаў. Такі-ж крах пацерпяць смешныя і нялоўкія выпады буржуазных эканамістаў супроць стаханаўскага руху. Гэтыя паны прабуюць даказаць, што стаханаўцы —гэта гіганты, уладаючыя звышчалавечай фізічнай сілай, што совецкая ўлада і партыя наўмысла падабрал. гэтых цыклопаў, перавыконваючых нормы на 1.000 процантаў і больш.

Можна толькі пасмяяцца з гэтых людзей, у якіх відавочна, атрафіравалася ўсякае ўменне разумець, што робіцца навакол. То яны пішуць аб «здрабненні» і «выраджэнні» нашага народу, то аб з'яўленні сотень тысяч цыклопаў. Якімі пігмеямі здаюцца гэтыя тупыя, абмежаваныя буржуа перад вялікім стаханаўскім рухам!

К СТАХАНАЎСКІМ ЗМЕНАМ, ЦЭХАМ, ЗАВОДАМ

Якія вынікі стаханаўскага руху ў Ленінградзе? Ён не толькі дапамог нам паспяхова выканаць па большасці прадпрыемстваў вытворчыя праграмы, але і забяспечыць выкананне заданняў другой пяцігодкі па металаапрацоўцы замест 5 год у 3 гады. (Апладысменты). Але гэта паказвае, што планы ў нас складаюцца мінімальныя. Факт, што нашы заводы могуць без дадатковых плошчаў, без дадатковага абсталявання ўзняць сваю прадукцыю на 50, а ў асобных выпадках і на 100 процантаў.

Як змянілася становішча ў снежні ў параўнанні, напрыклад, з красавіком 1935 года? У красавіку сустрэнешся з гаспадарнікам, пытаешся: чаму праграма не выконваецца? Ён адказвае: рабочай сілы не хапае, плошчаў не хапае, абсталявання не хапае, сыравіны няма. А цяпер перадавыя гаспадарнікі не толькі не турбуюцца аб тым, каб набыць дадатковае абсталяванне, а, наадварот, адмаўляюцца ад новых цэхаў, ад заліцняга абсталявання, а адносна недахвату рабочай сілы і гаварыць не прыходзіцца.

Вось тав. Дзюфур — беспартыйны дырэктар завода імя Варашылава. У красавіку ён гаварыў, што праграму не выканаем, калі не атрымаем 1.000 новых рабочых. А на нарадзе гаспадарнікаў 30 лістапада тав. Дзюфур выступаў і гаварыў, што яму новых рабочых не трэба, а праграму ён не толькі выканае, але і перавыканае. Што змянілася? Якое цуда адбылося?

У чым сакрэт стаханаўскіх метадаў? Ён вельмі просты: аўладай тэхнікай сваёй справы, вывучы свой варштат, не дапускай прастояў, забяспеч належную хуткасць варштата, забяспеч максімальнае выкарыстанне машыннага часу, калі разец у цябе робіць карысную работу, забяспеч правільную арганізацыю рабочага месца, забяспеч раздзяленне асноўнай работы ад дапаможнай, забяспеч нармальнае снабжэнне сыравінай і інструментамі, правядзі неабходныя рацыяналізатарскія мерапрыемствы, выкарыстай тэхніку да дна. Вось асноўныя метады, прымяняючы якія, стаханаўцы дабіліся найвялікшых поспехаў.

Але, таварышы, асобных вытворчых рэкордаў, якіх у нас многа, у тым ліку і па Ленінграду, можа дабіцца кожны рабочы і без асаблівай дапамогі інжынерна-тэхнічнага персаналу, без дапамогі дырэктара, начальніка цэха, майстра. А вось каб асобныя рэкорды, асобныя дасягненні зрабіць здабыткам змен, цэлых цэхаў і заводаў, і не на адзін дзень, а на дні, тыдні і месяцы, тут без узначалення руху з боку інжынерна-тэхнічных работнікаў ніяк не абыйсціся.

З гэтага пункту гледжання ў вышэйшай ступені важнай з'яўляецца тая новая форма стаханаўскага руху, якая, як і сам стаханаўскі рух, зарадзілася ў Данбасе — гэта стаханаўскія змены, стаханаўскія суткі і стаханаўскія пяціднёўкі.

Тут роля інжынерна-тэхнічнага персаналу і гаспадарнікаў становіцца рашаючай, бо тут гутарка ідзе аб тым, каб падрыхтаваць стаханаўскую работу цэлай змены, цэха, завода. Задача заключаецца ў тым, каб правільна спланаваць вытворчасць, правільна ўстанавіць графік работы, правесці гэты графік у жыццё, правільна размеркаваць падсобных і асноўных рабочых так, каб падсобныя рабочыя не тармазілі асноўных, падрыхтаваць сыравіну, поўфабрыкаты, інструмент. Дапусцім, здабыча вугалю ідзе фарсіравана, а адкадка не падаспела, — тут будзе ўдар і па здабычы. Таксама і ў іншых галінах гаспадаркі.

У адносінах узняцця стаханаўскага руху на новую вышэйшую ступень Данбас з'яўляецца піонерам, і я павінен прама сказаць, што, на наш сорам, мы не адразу падхапілі ключ барацьбы за стаханаўскія цэхі, змены, суткі і пяціднёўкі.

Павінен сказаць, што і нашы ленінградскія газеты ў гэтых адносінах адстаюць. Не гледзячы на тое, што «Правда» і «За индустриализацию» ўжо некалькі дзён пішуць аб гэтай новай форме стаханаўскага руху, нашы газеты праз меру павольна раскачваюцца і толькі апошнія дні пачалі варушыцца, хоць стаханаўскія цэхі і стаханаўскія змены, стаханаўскія тэхпланы, у нас з'явіліся не так ужо нядаўна. Наш друк павінен цясней звязацца з заводамі, каб быстра рагаваць на тое, што там робіцца. Узяць хоць-бы кавальскі цэх «Электросилы», дзе працуе парторгам ордэнаносец тав. Марцехаў. Там падыходзяць да таго, каб зрабіць цэх стаханаўскім. А кузня завода імя Сталіна? Вы памятаеце, што Сталінскі завод адставаў у стаханаўскім руху (аб гэтым мы сказалі і ў рашэннях пленума гарадскога камітэта), а зараз можна сказаць, што кузня завода імя Сталіна блізка к таму, каб стаць стаханаўскай.

У ліцейнай завода імя Карла Маркса раней таксама была вялікая адсталасць. Зараз там зусім адваротны малюнак. На хімзаводзе імя Мендзелеева арганізуецца пераход на стаханаўскія метады работы фарбацёрачнага цэха. На фабрыцы «Красный ткач» ёсць вельмі сур'ёзныя дасягненні на шляху пераводу фабрыкі на стаханаўскія метады работы. Тое-ж на канвееры фабрыкі «Пролетарская победа» і ў суперным цэху Нафхімкамбіната. Суперфасфатны цэх Нафхімкамбіната павялічыў выпрацоўку суперфасфату з 300 да 500 тон у суткі пры тойжа колькасці рабочых. На фабрыцы імя Халтурына, на карбюратарным заводзе імя Куйбышэва, на Северным верфі, на заводзе «Красный треугольник», на фабрыцы «Скороход», на Балтыцкім заводзе імя Орджанікідзе — па ўсіх гэтых фабрыках і заводах шырока распаўсюджваецца вопыт стаханаўскіх змен і сутак. Гэтыя формы стаханаўскага руху мы павінны ўсяляк заахвочваць і распаўсюджваць, забяспечваючы гэтым перавод стаханаўскага руху на новую, больш высокую ступень.

Пленум ЦК партыі ўказаў на тое, што не ўсе гаспадарнікі зразумелі значэнне стаханаўскага руху, што частка гаспадарнікаў, а ў тым ліку і комуністаў, у мінулым часамі заслужаных работнікаў, аказаліся ў палоне старых норм, старых праектных магутнасцей. Вы памятаеце, што мы ў сябе ў Ленінградзе апублікавалі рад такіх імён. Людзі зазналіся, задаволіліся дасягненнямі заніжаных праектных магутнасцей і не ўзначалілі стаханаўскага руху, а сустрэлі яго нават там-там варожа або поўварожа. З такімі настроямі трэба рашуча змагацца, а людзей, якія не жадаюць перабудавацца і пайсці ў нагу са стаханаўскім рухам, змяняць.

Частка інжынерна-тэхнічных работнікаў уключылася ў стаханаўскі рух. Але значная частка інжынерна-тэхнічных работнікаў аказалася ў палоне старых норм, старых дарэволюцыйных тэхнічных магутнасцей, у палоне буржуазных падручнікаў. Вучылі людзей па-старому, і яны не хочуць перавучвацца. Перад імі стаіць пагроза страціць усякі аўтарытэт як камандзіраў вытворчасці. Гэтых людзей стаханаўцы пакінулі ззаду. Ім трэба перавучвацца. Але вучыцца ў стаханаўцаў некаторым перашкаджае самалюбства, перашкаджаюць старыя навыкі. Вельмі ўелася старая руціна. У вышэйшых навучальных установах прадаўжаюць вучыць па старых падручніках. Трэба ў корані перавучвацца, калі хочаш ісці ў нагу са стаханаўцамі.

Партыйныя і прафесіянальныя арганізацыі недастаткова ўключыліся ў стаханаўскі рух. Гэта асабліва сказваецца ў стыхійнасці і няроўнамернасці развіцця стаханаўскага руху на нашых заводах. Ці правільна, калі па раду заводаў, у тым ліку і па Кіраўскаму, «Электросиле» і іншых, загатоўчыя цэхі ідуць па стаханаўскаму руху наперадзе, а турбінныя ці карпусны цэхі, цэхі апрацоўчыя, адстаюць? Вядома, не. Можа атрымацца такое становішча, што стаханаўцы ў загатоўчых цэхах наробяць масу поўфабрыкатаў, а апрацоўваць і збіраць не будзе каму, бо апрацоўчыя цэхі працуюць не па-стаханаўску. Такая няроўнамернасць, калі не ўмяшацца і не паправіць справы, можа выклікаць і сям-там ужо выклікае «вузкія месцы» вытворчасці.

Хто павінен унесці арганізаванасць у гэту справу? Мы, комуністы, партыйныя арганізацыі.

Неабходна з асаблівай сур'ёзнасцю адносіцца да тых указанняў пленума Цэнтральнага Камітэта, якія гавораць аб канкрэтных задачах у разгортванні стаханаўскага руху ў розных галінах нашай прамысловасці і на чыгуначным транспарце.

КАНКРЭТНЫЯ ЗАДАЧЫ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ

Задачы стаханаўскага руху ў розных галінах нашай народнай гаспадаркі, у розных галінах прамысловасці ставяцца па-рознаму. Ваяьміце першы пункт рашэння пленума Цэнтральнага Камітэта ў галіне цяжкай індустрыі, які гаворыць:

«1. Разгарнуць ва ўсю стаханаўскі рух **перш за ўсё ва ўсіх здабываючых** галінах, і, у першую чаргу, у **вугольнай і рудной** прамысловасці, дзе стаханаўскі рух упершыню пачаўся і разгарнуўся, у **нафтавай** прамысловасці, дзе да гэтага часу стаханаўскі рух не развіт, у **чорнай і каляровай** металургіі, у **будаўніцтве,** у вытворчасці **будматэрыялаў** і ў тых **хімічных** вытворчасцях, якія не абмежаваны сыравіннымі рэсурсамі (у першую чаргу, вытворчасць сінтэтычнага аміяка і азотных угнаенняў, сінтэтычнага каўчуку і т. д.).

Арганізацыя стаханаўскага руху павінна мець у гэтых галінах асноўнай сваёй мэтай максімальнае павелічэнне вытворчасці і зніжэнне яго сабекошту, выходзячы з таго, што вытворчая праграма з'яўляецца толькі мінімальным абавязковым заданнем».

Асаблівую завостранасць для Ленінграда мае другі пункт рашэння ЦК, паколькі мы з'яўляемся адным з буйнейшых цэнтраў машынабудаўніцтва.

«2. У **машынабудаўніцтве** стаханаўскі рух павінен быць накіраваны ў першую чаргу на лепшае выкарыстанне металу, на лепшае выкарыстанне рабочай сілы, на павышэнне выкарыстання машыннага часу, на высокую якасць вырабаў, на аўладанне вытворчасцю і патаненне ўласнаручных у тэхнічных адносінах і бездакорных па якасці машын на існуючым абсталяванні».

У галінах цяжкой прамысловасці, якая пераапрацоўвае дэфіцытную сыравіну, напрыклад, на заводзе «Кр. треугольник», у сучасны момант вытворчасць лімітуецца сыравінай. Калі завод будзе раздуваць стаханаўскі рух толькі ў галіне колькасці (там стаханаўцы выпрацоўваюць па 1.400 проц нормы і гэта вельмі добра паказвае, якія рэзервы магутнасцей мае «Кр. треугольник»), а на эканоміі сыравіны, павышэнне выхадаў, змяншэнне браку, выкарыстанне сурагатаў стаханаўскі рух не будзе чакроўвацца, то гэта будзе ісці ўразрэз з рашэннямі пленума ЦК і на шкоду стаханаўскаму руху на заводзе.

Разгортванне стаханаўскага руху ў металургіі з'яўляецца магутным вагаром стаханаўскага руху ў машынабудаўніцтве і металаапрацоўцы, бо ён рашае пытанне ў поўнай загрузцы ўсяго нашага абсталявання.

Рашэнне Цэнтральнага Камітэта з прэдзельнай канкрэтнасцю і яснасцю, з точным дыферэнцыяваннем задач па кожнай галіне прамысловасці ўказвае на тое, куды павінны весці справу пар-

(ПРАЦЯГ ДАКЛАДА ТАВ. А. А. ЖДАНАВА НА 3-й СТАР.)

*) Скарочаная стэнаграма.

ПРАЦЯГ ДАКЛАДА таварыша А. А. ЖДАНАВА

тыйцы, гаспадарнікі, профсаюзнікі і стаханаўцы ў кожнай галіне прамысловасці і транспарту.

Перад ленінградскімі партыйцамі, гаспадарнікамі і профсаюзнікамі стаяць вельмі адказныя задачы па кіраўніцтву рухам. Мы маем вельмі развітую гаспадарку па лініі ўсіх наркаматаў. Па Наркамцяжпрому мы маем вялікую колькасць прадпрыемстваў. Па Наркамлегпрому — тое-ж самае. У Ленінградскай вобласці развіта і лясная прамысловасць, харчовая прамысловасць у нас таксама абшырная галіна, па чыгуначнаму транспарту — дзве буйныя дарогі — Окцябрская і Кіраўская. Знайсці ў кожнай галіне прамысловасці сваё асобае звяно, за якое неабходна ўхапіцца, каб выцягнуць увесь ланцуг стаханаўскага руху, у гэтым задача партыйнага кіраўніцтва, якая пастаўлена перад намі рашэннямі Цэнтральнага Камітэта, і яе, гэту задачу, трэба ва што-б там ні стала вырашыць. І для гарадскога камітэта партыі, і для кіраўнікоў раёнаў, і для ўсіх заводскіх і чыгуначных работнікаў майстэрства кіраўніцтва заключаецца ў тым, каб не падыходзіць да ўсяго з адной меркай, а ўлічваць канкрэтныя асаблівасці і рознастайнасць умоў работы розных галін прамысловасці і транспарту.

Аб ролі комуністаў. У нас ёсць заводы, дзе комуністы прымаюць слабы ўдзел у стаханаўскім руху, цягнуцца ў хвасце. Ёсць «комуністы», якія супраціўляюцца стаханаўскаму руху.

Нямала яшчэ вылазак класавых ворагаў супроць стаханаўскага руху. Гэтыя вылазкі неабходна выкрываць, ворагаў стаханаўскага руху неабходна бязлітасна праследаваць.

АБ НОРМАХ ВЫПРАЦОЎКІ

Важнейшым пытаннем далейшага развіцця стаханаўскага руху з'яўляецца пытанне аб тэхнічных нормах і нормах выпрацоўкі. Пленум ЦК даў указанне аб замене пяперашніх тэхнічных норм новымі, больш высокімі. Адпаведна павінны быць перагледжаны нормы выпрацоўкі ў бок некаторага павышэння. Гэта работа, надзвычай важная і адказная, павінна быць праведзена па ўсіх галінах прамысловасці на працягу 1936 г.

Яна патрабуе дэтальнага, крапатлівага перагляду на аснове вопыту стаханаўцаў тэхнічных магутнасцей усіх агрэгатаў, варштатаў, машын.

У разультаце правядзення гэтай работы павінны быць устаноўлены новыя нормы выпрацоўкі. На прадпрыемствах няма зараз сапраўдных норм выпрацоўкі. Старыя нормы зломаны стаханаўцамі, а новых норм яшчэ няма. Працуюць па сутнасці без норм, бо старыя нормы — гэта фікцыя: яны зараз не могуць мабілізаваць нікога.

Ні ў адным пытанні адставанне гаспадарчай практыкі ад стаханаўскага руху не выявілася так рэзка, як у пытанні аб тэхнічным нармаванні. Важнейшая справа нармавання кіраўнікамі прадпрыемстваў і начальнікамі цэхаў была перададверана так званым нармоўшчыкам, і тым самым такі важнейшы вагар уздыму прадукцыйнасці працы, якім з'яўляюцца нормы, быў выпушчан з рук. Сярод нармоўшчыкаў вялікая колькасць людзей вучылася па старых кніжках, а то і проста не атрымала ніякай кваліфікацыі. Там нямала і меншавіцтвуючых элементаў і эпартуністаў з былых аддзелаў працы.

У свой час справа нармавання знаходзілася ў руках профсаюзаў. Вядома, што партыя павінна была нямала папрацаваць, каб ачысціць профсаюзы ад апартуністычных, трэд'юніяністскіх элементаў. Нямала іх засела ў нармовачных апаратах. Гэта паклала свой адбітак на практыку тэхнармавання. Але мала змянілася становішча і тады, калі нармаванне перайшло ў рукі гаспадарнікаў, бо такая важная справа, як вызначэнне норм, была перададверана малакваліфікаваным, другарадным работнікам.

Існуючыя нормы ў нас двух сартоў: гэта, па-першае, так званыя «тэхнічна ўгрунтаваныя» нормы, апракінутыя зараз стаханаўцамі, але нават іх менш, чым так званых «вопытна-статыстычных» норм, аснаваных на фактычнай выпрацоўцы не перадавых, а адсталых рабочых. І тыя і другія нормы з'яўляюцца тормазам для павышэння прадукцыйнасці працы. Вось прыклад рэакцыйнасці «тэхнічна-ўгрунтаваных» хранаметражных норм завода імя Варашылава: фрэзіроўка плоскасцей раз'ёму ўкладышу па разліку нармоўшчыка займае 4 мінуты, а стаханаўцы фрэзіруюць у 1½ мінуты.

Вось нормы на ўстаноўку і замацаванне штыфта на апраўцы токарнага варштата.

		Час	Проц.
Стаханавец затрачвае	0,30 м.	100	
Норма аб'яднання	0,85 м.	280	
Норма завода імя Свердлова	0,50 м.	166	
Норма завода імя Карла Маркса	0,60 м.	200	

Устанавіць і заправіць дэталь на фрэзерным варштаце:

Стаханавец затрачвае	0,45 м.	100	
Норма аб'яднання	0,80 м.	178	
Норма завода імя Карла Маркса	0,69 м.	154	
Норма Гіпрамаша	1,57 м.	350	

Такіх прыкладаў можна прывесці тысячы.

Такія «нормы» шкодзяць справе. Трэба ўстанавіць новыя, больш павышаныя нормы.

Праверка работы праектуючых арганізацый, зробленая апаратам Ленінградскага абкома і гаркома ВКП(б), ускрыла механіку праектавання заніжаных магутнасцей. Вазьміце завод «Красный химик». Па праектнай магутнасці, устаноўленай Гіпромхімпраектам, пэх сернай кіслаты можа даць 16.000 тон у год, а завод дае ўжо 32.000 тон, тым самым перакрыўшы праектную магутнасць у два разы. На Неўскім хімічным заводзе па цэху суперфасфату Гіпрахімпраект устанавіў магутнасць выпрацоўкі суперфасфату ў 200.000 тон у год, а завод лічыць, што ён можа даць 480 тыс. тон, г. зн. у 2 з паловай раза больш. Каго могуць мабілізаваць такія праектныя магутнасці? Нікога. Вазьміце працэс выспявання суперфасфату. Па нормах для выспявання ўстаноўлена 16 гадзін, а завод укладваецца ў поўгадзіны, г. зн. выконвае праектныя нормы на 1.600 проц. Куды варты гэтыя праектныя нормы?

У нас у Ленінградзе знаходзяцца такія «кіты» праектавання, як Гіпрамаш і Гіпрамез. У нас праектаваліся такія гіганты чорнай металургіі, як Магнітагорскі завод, Крыварожскі завод і рад іншых. Зараз выяснена, што праектныя магутнасці гэтых заводаў вельмі заніжаны. Напрыклад, па праекту Гіпрамаша, бессемераўскі цэх Крыварожскага завода можа даць 1.080.000 тон бессемераўскага металу, а пры перараз ліку на аснове вопыту стаханаўцаў аказваецца, што можна ўзяць з гэтага цэха на 600.000 тон сталі больш. Значыцца, пры праектаванні была зарэзервавана магутнасць у 600 тыс. тон металу. Таксама абстаіць справа з праектаваннем прадукцыйнасці новых домен і мартэнаў. Сюды павінна быць накіравана ўвага кіраўнікоў праектных арганізацый.

Наколькі далёкі некаторыя з нашых праектоўшчыкаў ад разумення сваёй ролі і абавязкаў у адносінах да стаханаўскага руху, паказвае заява аднаго з буйнейшых кіраўнікоў праектнай справы на нарадзе ленінградскіх гаспадарнікаў: «Мы, — гаварыў ён, — ужо ўключыліся ў стаханаўскі рух: нашы чарцёжнікі зараз чэрцяць удвая больш чарцяжоў, чым было да стаханаўскага руху». (Смех). Але калі ў гэтай падвоенай колькасці чарцяжоў утрымліваецца столькі-ж памылак, колькі і ў ранейшых чарцяжах, гэта азначае толькі, што падвойваецца колькасць тэхнічных памылак. Вось як людзі зразумелі лозунг: уключыцца ў стаханаўскі рух!

Праектоўшчыкі абавязаны крок за крокам уважліва, на аснове вопыту стаханаўцаў, перагледзець і пералічыць праектныя магутнасці. У гэтым іх задача.

Гіпраэспром — праектная арганізацыя па электратэхнічнай прамысловасці — праектуе колькасць патрэбных рабочых і абсталявання па старых, заніжаных нормах, па старых падручніках. Да гэтых разлікаў дадаецца яшчэ поўны рэзерв, і ў разультаце там, дзе можна абыйсціся адной колькасцю варштатаў, праектуюць удвая больш. Так складзен праект рэканструкцыі завода «Светлана». Робіць завод складам абсталявання. Гэта і ёсць арыентацыя на адсталасць, самы сапраўдны апартунізм на практыцы.

Ленінград адыгрывае выключную ролю ў праектовачнай рабоце. Такія ўсесаюзныя праектныя арганізацыі, як Гіпрамаш, Гіпрахім, Гіпрамез, Гіпрэспром і інш., з'яўляюцца законадаўцамі ў галіне выкарыстання новай тэхнікі. На справе-ж мы бачым, як частка работнікаў праектных арганізацый змыкаецца з адсталымі элементамі на фабрыках і заводах. Такое становішча павінна быць рашуча выпраўлена.

АБ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАЦЕ

Рашэнні ЦК указваюць, што некаторае павышэнне норм выпрацоўкі павінна быць звязана з тым, каб ва ўмовах прагрэсіўнай здзельшчыны цяперашнія расцэнкі былі захаваны, а фонд заработнай платы з прычыны росту стаханаўскага руху быў павялічан. Гэта рашэнне мае велізарнае значэнне для правільнай арганізацыі зарплаты для забеспячэння задачы далейшага павышэння прадукцыйнасці працы і зарплаты. Прагрэсіўна-здзельная аплата працы бліскуча апраўдала сябе, стварыўшы ўмовы для перамогі Данбаса і чорнай металургіі. У нас у Ленінградзе ў машынабудаўніцтве і ў іншых галінах прамысловасці прагрэсіўна-здзельная аплата працы пашырана недастаткова, пераважае прамая здзельшчына. Гэта няправільна. Трэба ўсяляк фарсіраваць пераход на прагрэсіўку. Такая ўстаноўка ЦК нашай партыі.

Гутарка ідзе аб тым, каб прагрэсіўна-здзельная аплата замяніла прамую здзельшчыну, бо для ажыццяўлення задачы павышэння прадукцыйнасці працы і стварэння зацікаўленасці рабочых у разультатах вытворчасці прагрэсіўная здзельшчына з'яўляецца самай дасканалай формай аплаты працы.

Якая практыка зарплаты існуе ў нас, у Ленінградзе? Па-першае, яшчэ моцна развіта «брыгадная» здзельшчына з яе ўраўнілаўкай і абязлічкай унутры брыгады. Шырока прымяняецца пачасовая аплата працы там, дзе можна перайсці на здзельшчыну. Але і там, дзе ўведзена здзельная аплата працы, яна ўведзена, галоўным чынам, як прамая здзельшчына, а пры прамой здзельшчыне ўсякае павышэнне норм цягнула за сабой зніжэнне расцэнак, а ўсякае перавыкананне норм цягнула за сабой абмежаванне размераў прыработку і, значыцца, не стымулявала барацьбы рабочых за павышэнне прадукцыйнасці працы.

Гэтыя недахопы прамой здзельшчыны не маюць месца пры прагрэсіўна-здзельнай аплаце працы, дзе, наадварот, рабочы зацікаўлен у перавыкананні норм, бо атрымлівае за выпрацаваную звыш 100 проц. плана прадукцыю павялічаную аплату. Таму мы павінны шырока ўкараніць на заводах і фабрыках Ленінграда прагрэсіўную здзельшчыну, перамогшы кансерватызм і нерашучасць у гэтай справе з боку многіх гаспадарнікаў, асабліва ў машынабудаўнічай прамысловасці.

Чаму ў нас некаторыя гаспадарнікі баяцца ўкаранення прагрэсіўнай сістэмы аплаты? Па-першае, унікаюць «ноўшаствуў», па-другое, таму, што першы вопыт прымянення прагрэсіўкі ў нас машынабудаўнікі правялі няправільна, устанавіўшы вельмі высокую аплату прагрэсіўкі і непамерна нізкую норму выпрацоўкі. Тым самым прагрэсіўка была пастаўлена пад прамую пагрозу дыскрэдытацыі. Так яно і вышла. У першы-ж год прымянення такой «прагрэсіўкі» былі дапушчаны велізарныя перавыдаткі фондаў заработнай платы без адпаведнага павышэння прадукцыйнасці працы, і замест выпраўлення па сутнасці, некаторыя прадпрыемствы Ленінграда вярнуліся назад да прагрэсіўнай здзельшчыны.

Трэба шырока ўкараніць здзельна-прэміяльную сістэму аплаты працы інжынерна-тэхнічных работнікаў, так бліскуча апраўдаўшую сябе на Макееўскім і іншых заводах, у тым ліку і на ленінградскіх. Пры акладной сістэме на радзе прадпрыемстваў атрымалася так, што інжынеры і майстры заробляюць менш стаханаўцаў. Ці ёсць такія прадпрыемствы ў Ленінградзе? (Голас з месца: ёсць). Чаму гэта здараецца? Таму, што стаханаўцы працуюць на здзельнай, а майстры і інжынерна-тэхнічныя работнікі па акладной сістэме. Але майстар павінен быць таксама зацікаўлены ў рэзультатах работы свайго цэха, як і стаханавец, яго аплата павінна быць прамым чынам звязана з рэзультатамі работы стаханаўцаў. Тым самым будзе забяспечан удзел інжынерна-тэхнічных работнікаў у арганізацыі стаханаўскага руху. Значыць, пяперашнія формы аплаты працы інжынерна-тэхнічных работнікаў павінны быць заменены новымі, зацікаўліваючымі іх у колькасці і якасці выпускаемай прадукцыі.

Востра стаіць пытанне аб аплаце працы пачасоўшчыкаў. Цяжка знайсці такую блытаніну, неразбярыху і беспарадак, як у зарплаце пачасоўшчыкаў. На радзе заводаў рамонтныя рабочыя заробляюць у залежнасці ад колькаснага плана рамонту: г. зн. чым больш варштатаў адрамонтаваў слесар, тым больш ён заробіў. А хіба правільна заахвочваць большую колькасць рамонту, гэта значыць прэміраваць за дранную якасць рамонту і за хутчэйшы зварот варштатаў у пакоры рамонт? Наадварот, рамонтнік павінен атрымліваць прэмію за тое, што яго варштаты знаходзяцца ў рабоце максімальна доўгі час. Падобны рабочы павінен быць зацікаўлены ў лепшай рабоце асноўнікаў. Усюды, дзе магчыма, пачасовая аплата павінна быць заменена прагрэсіўнай здзельшчынай. Значыцца, ліквідацыя буйнейшых недахопаў у справе нармавання працы і арганізацыі зарплаты з'яўляецца першачарговай прадпасылкай для арганізацыі разгортвання стаханаўскага руху, для правільнага кіраўніцтва прадпрыемствам.

Яшчэ горш абстаіць справа ў тэкстыляў. У іх прагрэсіўка арганізавана ўнутры нормы і пачынаецца з выканання 80 проц. ад нормы. Атрымліваецца, што тыя, хто выпрацоўвае 100 проц. нормы, пападаюць ў горшыя ўмовы, чым тыя, якія перавыпрацоўваюць 80 проц. Атрымліваецца «прэміяльная» сістэма павыварат. Яна не толькі не стымулюе барацьбы за выкананне і перавыкананне вытворчых планаў, але з'яўляецца прамым тормазам стаханаўскага руху ў тэкстыльнай прамысловасці і ўсякай барацьбы за павышэнне прадукцыйнасці працы. Даўно пара нашым тэкстыльшчыкам пакончыць з такім адставаннем і падцягнуцца да перадавых галін прамысловасці.

Гаворачы аб адставанні тэкстыльнай прамысловасці, неабходна таксама сказаць, што ў гаспадарчых кіраўнікоў лёгкай і, у прыватнасці, тэкстыльнай прамысловасці вялікім недахопам з'яўляецца заскарузлы кансерватызм, які сказваецца асабліва ў адсутнасці сур'ёзнай барацьбы за новую тэхніку. Дзве галіны нашай прамысловасці надзвычай адсталі ў тэхнічным пераўзбраенні — гэта лёгкая, а таксама лясная прамысловасць. І там і тут праз меру марудна ўкараняюць і асвойваюць новыя ўзоры абсталявання, і там і тут моцны рэакцыйныя погляды на новую тэхніку. І калі абавязак машынабудаўнікоў заключаецца ў тым, каб забяспечыць і лёгкую і лясную прамысловасць добрымі машынамі, то абавязак работнікаў лёгкай і лясной прамысловасці — зламаць антымеханізатарскія, рэакцыйныя настроі, выкрыць іх носьбітаў і даць дарогу новай тэхніцы.

Пленум ЦК, вызначаючы задачы стаханаўскага руху ў машынабудаўніцтве, указаў, што ён павінен забяспечыць аўладанне вытворчасцю і патаненне тэхніка ўдасканаленых, бездакорных па якасці машын. Гэта значыць, што стаханаўцы машынабудаўніцтва павінны забяспечыць няўхільны і быстры прагрэс машынабудаўнічай тэхнікі. У гэтай справе наша роля асабліва адказная. Мы з'яўляемся сапраўднай кузняй новай тэхнікі, новых машын і варштатаў. У 1936 годзе мы абавязаны асвоіць некалькі дзесяткаў новых тыпаў машын і паставіць нямала новых вытворчасцей.

Гэта баявая праграма павінна быць выканана ва што-б там ні стала. Гэта неабходна асабліва падкрэсліць у сувязі з тым, што ў часткі гаспадарнікаў, у сувязі з нашымі поспехамі, наглядаецца некаторая самасупакоенасць, зазнайства. А між тым ва многіх галінах мы яшчэ адстаем ад заграніччай тэхнікі.

Вазьміце слабаточную прамысловасць. Мы моцна адстаем ад заграніцы ў вытворчасці новых тыпаў апаратуры, прыёмнікаў, радыёлямп і т. д. «Светлана» і «Красная заря» і нават такі перадавы завод, як завод імя Казіцкага, павінны рашуча пакончыць з недапушчальным адставаннем у галіне ўкаранення новай тэхнікі. Нашы лямпы, нашы прыёмнікі, нашы станцыі павінны быць не горш, а лепш замежных. Званне перадавога завода павінен насіць завод, які не толькі выконвае і перавыконвае свой вытворчы план, але і стаіць на вышыні сучаснай тэхнікі, даганяючы і пераганяючы заграніцу ў справе асваення новых узораў. (Апладысменты).

З усёй большэвіцкай праматой мы павінны выступіць супроць самадавольства, супроць апартуністычнай самасупакоенасці ў адносінах ўкаранення новай тэхнікі. Гэта тым больш неабходна, што асваенне новых тыпаў вытворчасці звязана з пэўнай зменай тэхналогіі і наогул з «прыкрымі» клопатамі. Па-«старынцы» працаваць лягчэй. Тым з большай сілай ленінградскія гаспадарнікі і тэхнікі, якія стаяць на перадавых пазіцыях барацьбы за новую тэхніку, павінны быць у першых радах застрэльшчыкаў далейшага тэхнічнага прагрэсу. Наша канструктарская і тэхнічная мысль павінна біць ключом. Лозунг «дагнаць і перагнаць» у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны павінен накіроўваць кожнага работніка ў кожнай галіне вытворчасці да асваення новай тэхнікі.

Яшчэ адна заўвага — аб студзеньскай праграме. Тав. Сталін у дакладзе на пленуме ЦК падкрэсліў, што студзень павінен быць экзаменам для нашых прадпрыемстваў. Калі прадпрыемствы ў студзені па выпуску прадукцыі захаваюць і перавысяць снежаньскія паказальнікі, а к гэтаму ўсе ўмовы ёсць, то можна ўпэўнена сказаць, што гэтыя прадпрыемствы выканаюць і перавыкананюць гадавую праграму. Таварышы, забяспечце справу так, каб студзень ішоў, па меншай меры, на ўзроўні снежня, — гэта будзе практычны вывад з рашэнняў пленума ЦК, па якому можна будзе ацаніць якасць вашага кіраўніцтва прадпрыемствамі.

Такія практычныя задачы нашай арганізацыі ў сувязі з рашэннямі пленума ЦК па першаму пытанню.

Вопыт праверкі паказаў нам, як многа трэба яшчэ зрабіць для выканання асноўнага лозунга нашай арганізацыйнай работы, данага таварышам Сталіным на XVII з'ездзе партыі, — падцягнуць арганізацыйную работу да ўзроўню палітычнага кіраўніцтва. Мы павінны да канца ўсвоіць урокі праверкі і зразумець, што адсутнасць пільнасці, няўмечне паставіць арганізацыйную работу, расхлябанасць, распушчанасць з'яўляюцца галоўнейшымі перашкодамі ў справе ўзмацнення партыйнай работы.

Праверка ўскрыла рад грубейшых парушэнняў статута партыі, што пацягнула за сабой пранікненне ў большэвіцкія рады яўна варожых і чужых элементаў. Для прыкладу можна прывесці групавы метад прыёму ў партыю, які практыкаваўся ў радзе арганізацый, у тым ліку і ў Ленінградзе. Гэты метад групавога прыёму, вядома, нічога агульнага не мае са статутам нашай партыі і з барацьбой за павышэнне якасці прымаемых. Дзе-ні-дзе абвяшчалі нават спаборніцтва на лепшы прыём, былі арганізаваны брыгады па вярбоўцы, дзе-ні-дзе ўстанаўлялася 5-дзенная справаздачнасць па вярбоўцы, усё роўна як па хлебазагатоўках або па сяўбе.

У нас, напрыклад, на заводзе «Большевик» у адным з цэхаў перад XVI з'ездам партыі сабралася ячэйка і пастанавіла: на працягу месяца падвоіць свае рады, для чаго павесці актыўную вярбоўку рабочых і т. д. Што гэта мае агульнага з правільным адборам лепшых элементаў з рабочага класа ў нашу партыю? Нічога.

ЦК указаў, што пры абмене дакументаў не трэба выдаваць білеты пасіўным комуністам. У сувязі з праверкай мы адбіралі партыйныя білеты галоўным чынам у тых выпадках, калі выяснялася, што даны чалавек з'яўляецца жулікам, несумленным чалавекам, які ашуканчым спосабам прабраўся ў партыю. Але ў нас яшчэ засталася некаторая колькасць членаў партыі, у якіх партбілеты ў парадку, але якія на справе не апраўдваюць высокае званне комуніста. Калі ў комуніста ўсё ў парадку, білет у парадку, учотная картка ў парадку, але ён не прымае ўдзелу ў стаханаўскім руху, не працуе над сабой, у той час як беспартыйныя стаханаўцы ідуць наперад, павышаюць прадукцыйнасць працы, свой культурны ўзровень, мы павінны развітацца з такім комуністам.

Наша партыя абрасла магутным слоем непартыйных большэвікоў, якія хочуць далучыцца да работы нашай партыі і ўступаюць зараз у групы спачуваючых. Захоўваючы строга індывідуальны прыём, мы павінны гэтых сапраўды перадавых рабочых ужо зараз рыхтаваць да прыёму ў партыю.

З 1 чэрвеня пачынаецца прыём у партыю. Падрыхтоўка да прыёму павінна пачацца ўжо зараз. Мы павінны ўзброіць таварыша, жадаючага ўступіць у партыю, нашым палітычным вопытам. Гэта велізарная, пачэсная, ўдзячная задача стаіць зараз перад нашымі партарганізацыямі, перад сакратарамі райкомаў і парткомаў.

Мы павінны ўзняць на яшчэ большую вышыню годнасць і званне члена партыі, як гэтаму штодзенна вучыць нас таварыш Сталін. Мы павінны навучыцца і навучыць другіх любіць і берагчы партыю, як зяніцу вока, павінны дабіцца таго, каб партбілет быў у вартых руках.

У адносінах арганізацыі работы па падрыхтоўцы прыёму ў партыю і работы са спачуваючымі нам трэба вучыцца ў Цэнтральнага Камітэта партыі і рабіць так, як робіць Цэнтральны Камітэт, праводзячы работу з непартыйнымі большэвікамі.

Вазьміце нарады перадавікоў-трактарыстаў, перадавікоў-камбайнераў і інш. Гэтыя нарады згуртоўваюць вакол ЦК і вакол нашай партыі тысячы лепшых людзей краіны.

На нараду па будаўніцтву пры ЦК былі запрошаны не толькі буйнейшыя партыйныя і гаспадарчыя работнікі краіны, але і стаханаўцы. Там былі беспартыйныя будаўнікі, каменшчыкі, арматуршчыкі і інш., якія працавалі ў камісіі ЦК разам з членамі Палітбюро, прымаючы актыўны ўдзел у распрацоўцы пастановы.

Бярыце гэтыя прыклады работы Цэнтральнага Камітэта, вучыцеся на іх і ўцягвайце спачуваючых і не знаходзячыхся ў групах спачуваючых непартыйных большэвікоў да ўсёй нашай работы. Не бойцеся прыцягваць іх для выпрацоўкі адказных рашэнняў. Гэтым самым вы вырасціце добры актыў. Падыйдзіце да іх не як педагогі, а як палітыкі і арганізатары, з належным размахам і тырынёй. Калі вы так арганізуеце работу ў сувязі з падрыхтоўкай прыёму ў партыю, вы дапаможаце падрыхтаваць у партыю лепшых перадавікоў, лепшых людзей з рабочага класа, лепшых калгаснікаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Калі ўзяць абодва пытанні — пытанне аб стаханаўскім руху і пытанне аб партыйнай праверцы, — то з гэтых двух нібы стаячых у розных плоскасцях пытанняў можна зрабіць адзін агульны вывад. І для таго, каб ператварыць стаханаўскі рух ва ўсенародны рух, і для таго, каб узняць арганізацыйную работу нашай партыі да ўзроўню палітычнага кіраўніцтва, для таго, каб узняць годнасць члена партыі, каб членскі білет быў у вартых руках, неабходна палепшыць і ўзняць на яшчэ большую вышыню майстэрства нашага кіраўніцтва. У стаханаўскім руху задача кіраўніцтва заключаецца ў тым, каб ад рэкордаў асобных стаханаўцаў перайсці да стаханаўскіх цэхаў і заводаў. У партрабоце галоўнае заключаецца зараз у тым, каб, ахоўваючы, як зяніцу вока, і аберагаючы нашу партыю, павышаючы пільнасць членаў партыі, узбройваючы сябе вялікім вучэннем Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, аўладаць дасканала арганізацыйным і тэхнічным бокам справы, памятаючы, што аўладанне тэхнікай партыйнай работы — справа не менш, а больш складаная, чым аўладанне тэхнікай вытворчасці. Праверка партдакументаў наглядна паказала, як на практыцы трэба падцягваць арганізацыйную работу да ўзроўню палітычнага кіраўніцтва і як шкодна запушчанасць і адставанне арганізацыйна-тэхнічнай работы.

Абедзве задачы — і задача развіцця стаханаўскага руху і задача абмену партбілетаў і прыёму ў партыю — патрабуюць ад партыйных кіраўнікоў, ад партыйных работнікаў яшчэ большага аўладання майстэрствам кіраўніцтва. У нас ёсць у каго вучыцца гэтаму майстэрству кіраўніцтва; яму мы павінны вучыцца ў чалавека, які ўвасабляе ў сабе ўсё майстэрства большэвіцкага кіраўніцтва, у вялікага майстра большэвізма, у нашага правадыра — таварыша Сталіна. (Бурныя апладысменты).

Калі чытаеш і перачытваеш працы нашых правадыроў, іх творы і прамовы, то ў святле нашай практыкі тая ці іншая грань, тое ці іншае ўказанне ці палажэнне, той ці іншы тэзіс набывае ўсё новае і новае значэнне. І, як правільна сказаў тав. Мікаян на пленуме ЦК, чытаеш і не можаш вычарпаць усёй глыбіні скарбніцы вопыту, тэорыі і практыкі нашых правадыроў — Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Як геолаг не можа вычарпаць усіх скарбаў, закладзеных у нетрах нашай краіны, так і мы ўсякі раз знаходзім новыя і новыя багацці мыслі ў працах нашых вялікіх настаўнікаў.

Нельга прайсці міма выказвання таварыша Сталіна на студзеньскім пленуме ЦК у 1933 г. Вось што ён гаварыў тады:

«У перыяд першай пяцігодкі мы здолелі арганізаваць энтузіязм, пафас **новага будаўніцтва** і дабіліся рашаючых поспехаў. Гэта вельмі добра. Але пяпер гэтага недастаткова. Цяпер гэту справу павінны мы дапоўніць энтузіязмам, **пафасам асваення** новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным узняццем прадукцыйнасці працы, сур'ёзным скарачэннем сабекошту.

У гэтым цяпер галоўнае.

Бо толькі на гэтай базе мы можам дабіцца таго, каб, скажам, к другой палове другой пяцігодкі узяць новы магутны разбег як у галіне будаўніцтва, так і ў галіне прыросту прамысловай прадукцыі».

Здзіўляешся празорлівасці і праніцальнасці нашага правадыра, які тры гады таму назад прадбачыў той рост тэмпаў і той росквіт заможнага культурнага жыцця, у які мы ўступілі зараз. (Апладысменты).

***

Таварышы, зараз увесь свет падводзіць вынікі 1935 г. і думае аб перспектывах 1936 г. Капіталістычны свет баіцца заглядваць у будучае. Капіталістычны свет у жуласці і трывозе стаіць перад рэзультатамі 1935 г. На самой справе, што ёсць у балансе капіталістычнага свету за 1935 г.? Вайна паміж Італіяй і Абісініяй, новая агрэсія Японіі ў Кітаі, падрыхтоўка новага перадзелу свету шляхам новых войнаў, фашысткае адзічанне, упадак культуры, дзесяткі мільёнаў беспрацоўных. Буржуазія баіцца заглядваць у будучае, бо яно суліць ёй гібель. Буржуазія часта зварачаецца да ўсякага роду магаў, чараўнікоў, кудзеснікаў, знахароў для таго, каб яны прадраклі для яе шчаслівае будучае, «новае» шчасце ў новым годзе. Ніякага новага шчасця буржуазія ў 1936 г. не дачакаецца.

Толькі наша вялікая партыя на чале з таварышам Сталіным выканала заветы Леніна, забяспечыла сапраўдны росквіт шчаслівага жыцця. Толькі наша вялікая краіна без страху і сумненняў з цвёрдай упэўненасцю глядзіць у будучае, бо мы з вамі з'яўляемся гаспадарамі свайго жыцця.

Для нас 1935 год быў пераможным годам, які ўвойдзе ў гісторыю як год найвялікшых нашых поспехаў, як год пачатку стаханаўскага руху. А 1936 год будзе і павінен стаць годам таго разбегу, які прадбачыў таварыш Сталін і які ператворыць нашу краіну ў перадавую краіну ў свеце па небываламу ў гісторыі чалавецтва росквіту цывілізацыі і культуры, у першую краіну па багаццю, заможнасці, у краіну шчаслівага, светлага, радаснага жыцця для ўсіх працоўных (**Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты, усе ўстаюць і апладзіраваюць таварышу Жданаву авацыю**).

II. Вынікі праверкі партыйных дакументаў і нашы задачы

Другое пытанне, якое абмяркоўвалася на пленуме ЦК, — гэта даклад тав. Ежова аб выніках праверкі партыйных дакументаў.

Праверка партыйных дакументаў з'явілася важнейшым арганізацыйна-палітычным мерапрыемствам, якое ўмацавала рады нашай партыі, боездольнасць партыйных арганізацый, пільнасць членаў партыі, узняло ўсю нашу партыйную работу на новую ступень.

Праверка партыйных дакументаў праводзілася па ініцыятыве таварыша Сталіна і была накіравана на тое, каб ліквідаваць безадказнасць і распушчанасць у справе ўчоту, хавання і выдачы партыйных дакументаў і навесці парадак у нашым партыйным доме. Праверка ставіла задачай — вышвырнуць з партыі жулікаў, авантурыстаў, шпіёнаў, якія прабраліся ў нашу партыю, карыстаючыся ратазействам многіх партработнікаў.

Зараз праверка падыходзіць к канду. Рад абласных арганізацый нашай партыі ўжо закончылі праверку і зрабілі справаздачу перад ЦК. Напярэдадні сканчэння праверкі знаходзіцца і наша ленінградская арганізацыя.

Праверка разгортвалася паступова. Спачатку некаторыя партыйныя арганізацыі лічылі праверку чыста тэхнічнай, другарадной справай і не звярнулі ўвагі на ўказанне ЦК, што справа праверкі павінна знаходзіцца ў руках кіруючых партыйных работнікаў, у руках сакратароў партыйных камітэтаў. Была дапушчана вялікая колькасць памылак. Вы памятаеце рашэнне ЦК па Заходняй вобласці, па некаторых раёнах Курскай вобласці і па цэламу раду іншых раёнаў. Пасля рашучага націску ЦК партыйныя арганізацыі падцягнуліся. З другога боку, сям-там прабавалі «правярнуць» праверку на працягу аднаго—двух месяцаў. Вы ведаеце, што мы тут у Ленінградзе гэтай заганай не хварэлі, у нас не было тэнденцыі закончыць праверку, скажам, к 15 чэрвеня ці к 1 ліпеня. Але затое мы моцна адсталі на апошнім этапе праверкі, і нам прышлося мабілізаваць некаторую колькасць партыйных работнікаў, каб прыйсці на дапамогу адстаўшым раёнам, асабліва па Ленінграду.

Цяперашняя праверка партыйных дакументаў адрозніваецца ад усёй папярэдняй работы па ачышчэнню радоў партыі, калі гэта работа перадаваралася спецыяльным камісіям. Зараз ніякіх камісій не арганізоўвалася і праверка партыйных дакументаў была даручана непасрэдна сакратарам і членам бюро райкомаў. Нагрузка была, праўда, давольна грунтоўная. Але людзі працавалі чэсна — дзень і ноч. І цяпер задача заключаецца ў тым, каб метады праверкі перанесці на работу па абмену партыйных білетаў, які будзе праведзен з 1 лютага па 1 мая, і затым забяспечыць гэтыя большэвіцкія метады ва ўсёй далейшай нашай рабоце, асабліва ў справе новага прыёму ў партыю, як: павінен быць адкрыт з 1 чэрвеня 1936 года.

Якія ў нас рэзультаты праверкі? Выключана з партыі па Ленінграду 7.274 члены партыі і па сельскіх раёнах — 2.641, па Карэліі — 242. Усяго з агульнага ліку прайшоўшых праверку выключана каля 8 процантаў. Сярод выключаных прыкметнае месца займаюць контррэволюцыйныя зіноўеўцы.

У працэсе праверкі выкрылася сур'ёзнае засмечанне партыйнага апарата чужымі людзьмі.

У рэзультаце праверкі значна ўпарадкавалася практыка пераездаў членаў партыі, учоту членаў партыі. Выявіліся новыя кадры вылучэнцаў. Па Ленінграду, па няпоўных даных, колькасць такіх вылучэнцаў налічваецца каля 1.000 чалавек. Усе яны вылучаны на прапагандысцкую і арганізацыйную партыйную работу.

Павысілася партыйная дысцыпліна, палепшылася наведванне партыйных сходаў, наладзілася ўплата членскіх узносаў. Мы мелі да праверкі ўвесь час недабор па членскіх узносах, які некаторымі тлумачыўся тым, што ў нас колькасць членаў і кандыдатаў партыі меншая, чым значыцца па статыстыцы. Зараз мы маем значнае перавыкананне заданняў па членскіх узносах, хоць колькасць членаў і кандыдатаў партыі ў нас некалькі зменшылася за гэты час. (Ажыўленне ў залі). Мы маем значнае ўмацаванне партыйнай работы і партыйных радоў. Павысілася пільнасць партыйных арганізацый, узнялася іх боездольнасць.

Партыйная праверка паказала ўсю недарэчнасць і бязглуздасць пашыранага сярод некаторай часткі партыйных таварышоў погляду, быццам паварот тварам да партыйнай работы азначае забыццё гаспадарчай работы. Я думаю, на вопыце Ленінграда можна бліскуча даказаць, што без павароту да партыйнай работы не было-б магчыма разгортванне стаханаўскага руху і датэрміновае выкананне ленінградскімі большэвікамі вытворчага плана 1935 г. Гэтыя поспехі знаходзяцца ў пяснейшай сувязі з умацаваннем партыйнай работы. (Апладысменты).

Пленум ЦК прапануе партыйным арганізацыям атрымаць усе неабходныя ўрокі з праверкі партыйных дакументаў. Таварыш Сталін яшчэ на студзеньскім пленуме ЦК 1933 года гаварыў аб тым, што нашы перамогі не могуць не выклікаць новага, у яшчэ больш вострых формах, наскоку на нас класавых ворагаў. Вопыт праверкі паказаў усю справядлівасць і праніцальнасць гэтага папярэджання таварыша Сталіна. Многія з партыйных работнікаў на гэта папярэджанне не звярнулі належнай увагі.

Аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза ССР на 1936 год

ПРАЦЯГ ПАСТАНОВЫ ДРУГОЙ СЕСІІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР VII СКЛІКАННЯ

2. Зацвердзіць звод даходаў і расходаў агульнасаюзнага бюджэту па даходах і расходах у 61.517.799 тыс. руб.

3. Зацвердзіць у адпаведнасці з устаноўленым размеркаваннем даходаў паміж агульнасаюзным бюджэтам і бюджэтамі саюзных рэспублік зводы дзяржаўных бюджэтаў саюзных рэспублік на 1936 год у агульных балансавых выніках (без адлічэння у мясцовыя бюджэты):

	(У тыс. руб.)
Па бюджэту РСФСР	2.280.101
» » УССР	915.625
» » БССР	290.072
» » ЗСФСР	566.416
» » Турк. ССР	154.420
» » Узб. ССР	390.824
» » Тадж. ССР	143.287
	4.740.745

4. Зацвердзіць адлічэнні ў мясцовыя бюджэты, правадзімыя праз дзяржаўныя бюджэты саюзных рэспублік, уключаючы адлічэнні ад сродкаў дзяржаўнага соцыяльнага страхавання на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы, у наступных сумах:

	(У тыс. руб.)
Па бюджэту РСФСР	8.510.328
» » УССР	2.321.989
» » БССР	365.196
» » ЗСФСР	651.424
» » Турк. ССР	128.954
» » Узб. ССР	358.992
» » Тадж. ССР	119.601
Усяго	12.456.484

5. Даручыць Совету Народных Камісараў Саюза ССР зацвердзіць процанты адлічэнняў ад падатку з абароту ў бюджэты саюзных рэспублік і мясцовыя бюджэты на 1936 г.

6. Адобрыць зводы кантрольных лічбаў мясцовых бюджэтаў у наступных балансавых выніках:

	(У тыс. руб.)
РСФСР	11.695.341
УССР	3.006.547
БССР	429.271
ЗСФСР	858.546
Турк. ССР	156.794
Узб. ССР	446.032
Тадж. ССР	139.896
	16.732.427

Сесія ЦВК Саюза ССР асобна адзначае, што велізарныя поспехі ў галіне прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, у галіне чыгуначнага і воднага транспарту і развіцця тавараабароту, ліквідацыя картак і шырока разгарнуўшаяся, на аснове стаханаўскага руху, барацьба за рэнтабельнасць у дзяржаўных прадпрыемствах ствараюць выключныя магчымасці для далейшага ўмацавання совецкага рубля і ўзмацнення яго ролі ў сацыялістычным будаўніцтве.

У сувязі з гэтым сесія ЦВК Саюза ССР **пастанаўляе:**

1. Улічваючы ўзрастаючую ролю ўласных накапленняў гаспадарчых органаў у фінансаванні праграмы капітальнага будаўніцтва на 1936 г., прапанаваць усім гаспадарчым наркаматам, соўнаркомам саюзных рэспублік і НКФ СССР забяспечыць поўнае і своечасовае паступленне прадназначаных для фінансавання капітальнага будаўніцтва ўласных сродкаў гаспадарчых органаў на рахунку банкаў фінансавання капітальнага будаўніцтва.

Побач з гэтым, абавязаць Наркамфін СССР узмацніць работу банкаў фінансавання капітальнага будаўніцтва па кантролю за захоўваннем усімі без выключэння будоўлямі праектнай і каштарыснай дысцыпліны і ўстаноўленых на 1936 г. заданняў па зніжэнню кошту будаўніцтва.

2. Улічваючы прыняты на 1936 год вялікі прырост уласных абаротных сродкаў гаспадарчых органаў, як за кошт уласных накапленняў, так і за кошт бюджэту, прапанаваць гаспадарчым наркаматам, СНК саюзных рэспублік і Наркамфіну СССР узмацніць кантроль за становішчам уласных абаротных сродкаў гаспадарчых органаў, выкананнем імі ўстаноўленых планам заданняў па паскарэнню абарочваемасці гэтых сродкаў і недапушчэннем скарыстання іх на якія-небудзь іншыя мэты.

Абавязаць Наркамфін СССР пры фінансаванні гаспадарчых органаў на папаўненне іх уласных абаротных сродкаў і Дзяржаўны банк СССР пры крэдытаванні гаспадарчых органаў строга сачыць за скарыстаннем па назначэнню маючыхся ў гаспадарчых органаў уласных абаротных сродкаў, спыняючы фінансаванне і крэдытаванне тых арганізацый, якія свае ўласныя абаротныя сродкі і прадастаўленыя ім крэдыты Дзяржаўнага банка адцягваюць ад задач далейшага расшырэння вытворчасці і тавараабароту і накіроўваюць іх на звышпланавыя накапленні матэрыяльных каштоўнасцей, не прадугледжаныя планам капіталаўкладання, або на адміністрацыйна-гаспадарчыя расходы.

3. Прымаючы пад увагу велізарны прыняты на 1936 г. рост расходаў на соцыяльна-культурныя мерапрыемствы і недастатковую ўпарадкаванасць у скарыстанні гэтых грошай ва многіх установах і арганізацыях, ведаючых соцыяльна-культурнымі мерапрыемствамі, — прапанаваць СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, край(вобл.)выканкомам звярнуць у 1936 годзе асаблівую ўвагу на арганізацыю фінансавай дапамогі, учоту, справаздачнасці і дакументальных рэвізій ва ўсіх арганізацыях, ведаючых соцыяльна-культурнымі мерапрыемствамі.

4. Адзначаючы асаблівае значэнне прынятага СНК СССР дэкрэту ад 3 жніўня 1935 года аб упарадкаванні фінансавай работы сельсоветаў і ад 5 студзеня 1936 года аб даходных крыніцах сельскіх бюджэтаў, прапанаваць СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, край(вобл.)выканкомам і раённым выканкомам, а таксама НКФ СССР і яго мясцовым органам забяспечыць у 1936 годзе на аснове гэтых законаў далейшае ўмацаванне сельскага бюджэту, паляпшэнне фінансавай работы сельсоветаў, у першую чаргу ў галіне падатковай, бюджэтнай і страхавой.

Сесія ЦВК СССР асабліва адзначае, што за ўмовах узмацнення ролі грошай і ўмацавання совецкага рубля велізарнае значэнне набывае далейшае ўпарадкаванне ўсёй бюджэтнай работы, поўнае выкананне даходаў, прадугледжаных бюджэтам, строга мэтавае скарыстанне сродкаў, якія адпускаюцца па бюджэту, своечасовае і поўнае выкананне ўсімі гаспадарчымі органамі іх абавязацельстваў у адносінах да бюджэту і найстражэйшае захаванне бюджэтнай дысцыпліны і ўстаноўленых законам правіл выдаткавання бюджэтных сродкаў.

Старшыня ЦВК Саюза ССР М. КАЛІНІН.

Сакратар ЦВК Саюза ССР І. АКУЛАЎ

Масква, Крэмль, 16 студзеня 1936 г.

Нікелевая манета новага ўзору

Народным камісарыятам фінансаў Саюза ССР выпускаецца ў зварот разменная нікелевая манета новага ўзору 10, 15 і 20-капеечнага кошту.

Гэта манета адрозніваецца ад той, якая знаходзіцца ў звароце, толькі знешнім афармленнем (рысункам).

ЛІЦАВЫ БОК МАНЕТЫ

У сярэдзіне — паглыблены васьмікутнік. На гэтым васьмікутніку выпуклае абазначэнне кошту манеты: 20, 15 ці 10 і пад ім шырокім, дробным шрыфтом слова: коп. Пад васьмікутнікам абазначан год чаканкі: 1935 г. Васьмікутнік акантаван: злева — дубовай галінкай і закругленым пшанічным сцяблом, які заканчваецца ўверсе коласам, справа — дубовай галінкай з дубмма пучкамі з трох лісцяў у кожным.

АДВАРОТНЫ БОК МАНЕТЫ

У верхняй палове поля—герб СССР. Пад гербом на вольным полі манеты вертыкальныя літары СССР шырокім шрыфтом, размешчаныя ў адзін закруглены радок адпаведна акружыне манеты.

Разменная нікелевая манета новага ўзору будзе мець хаджэнне нароўні з наяўнай срэбнай і нікелевай манетай.

Памяці В. І. Леніна

ВІЦЕБСК, 19 студзеня. (БЕЛТА). Па ўсіх цэхах і брыгадах прадпрыемстваў горада праводзяцца гутаркі і даклады на тэму «Барацьба за выкананне ленінскіх заветаў пад кіраўніцтвам правадыра партыі таварыша Сталіна». Ідзе падрыхтоўка да вечароў, прысвечаных памяці Владзіміра Ільіча, якія адбудуцца 21 і 22 студзеня.

У Доме партыйнага актыва арганізавана выстаўка літаратуры і фотаздымкаў аб жыцці і дзейнасці Леніна. Такая-ж выстаўка арганізавана і ў партгабінеце завода «Чырвоны металіст» імя Кірава. На кватэрах васьмі лепшых стаханаўцаў завода будуць праведзены гуткі аб Леніне. Партком швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» арганізаваў гуткі аб Леніне ў дзіцячым садзе і ў падшэфнай дзіцячай комуне.

***

ГОМЕЛЬ, 19 студзеня. (БЕЛТА). У Доме партыйнага актыва арганізавана фотавыстрына, якая ілюструе жыццёвы шлях Владзіміра Ільіча. Чыгуначны клуб імя Леніна рыхтуе вечар памяці Ільіча. Чыткі паасобных твораў Леніна праводзяцца на кватэрах стаханаўцаў—саставіцеляў паязду Цурбана і Хаутлянцава. Па ўсіх школах горада дзеці рыхтуюць календары, прысвечаныя Леніну, і вершы аб Ільічу.

***

На менскім машынабудаўнічым заводзе імя Кірава рабочы калектыў адзначае ленінскія дні стаханаўскай трохдзенкай (19—21 студзеня. Праведзены гуткі на тэму «Запаветы Леніна аб прадукцыйнасці працы і ролі тэхнікі ў пабудове сацыялістычнага грамадства». Цэхі ўпрыгожаны лозунгамі: «Адзначым дні памяці аб вялікім Леніне большэвіцкім правядзеннем стаханаўскай трохдзенкі».

АГІТЗВЯНО Ў БАБРУЙСКУ І ГОМЕЛІ

БАБРУЙСК. **(Спец. кар. «Звязды» на борту самалёта агітэскадрыльі імя Максіма Горкага).**

16 студзеня ў 17 г. 40 мін. агітзвяно прызямлілася ў раёне Бабруйска. Для сустрэчы самалётаў сабраліся шматлікія делегацыі бабруйскіх прадпрыемстваў і ўстаноў. Тут-жа адбыўся кароткі мітынг. Вечарам на кватэрах лепшых стаханаўцаў кандзіцерскай фабрыкі «Чырвоны харчавік» і швейнай фабрыкі імя Дзержынскага адбыліся таварыскія сустрэчы стаханаўцаў з удзельнікамі агітаблёту.

***

ГОМЕЛЬ, 19 студзеня. Учора, у 15 г. 20 мін., вылецелі з Бабруйска на Гомель. За 50—60 кілометраў ад Гомеля надвор'е рэзка змянілася. Трапілі ў суцэльны туман, вецер. Самалёты абледзянелі. Толькі дасканалае ведане тэхнікі дало магчымасць маладым пілотам тт. Дземіну і Мураўёву прывесці машыны ў поўнай спраўнасці.

У 17 г. 30 мін. самалёты прызямліліся ў раёне Гомеля.

19 студзеня ўдзельнікі агітаблёту наведалі варштатабудаўнічы завод імя Кірава, швейную фабрыку «Комінтэрн». Вечарам адбылася таварыская сустрэча экіпажу самалётаў са стаханаўцамі завода імя Кірава. На сустрэчы прысутнічала 70 стаханаўцаў.

Д. МАЛЕВІЧ.

ПОШТА МЕНСКА ЗА ГОД

У 1935 годзе менская пошта атрымала простых карэспандэнцый 6.166.386, заказных—1.044.465, пераводаў — 328.688, каштоўных пісем — 12.185, пасылак — 111.283, перыядычных выданняў—19.283.230. За гэты-ж перыяд пошта адправіла ва ўсе канцы краіны простай карэспандэнцыі 5.987.437 адзінак, заказной — 613.641, пераводаў—236.753, каштоўных пісем—15.521, пасылак 204.193 і т. д.

21 студзеня 1936 года, у 7 гадзін вечара, у памяшканні залы з'ездаў Дома ўрада адбудзецца

ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ

сумесна з партыйнымі, комсамольскімі, прафесіянальнымі і ваенскімі арганізацыямі,

прысвечанае 12-й гадавіне смерці

Владзіміра Ільіча ЛЕНІНА.

На пленум праходзяць па сваіх мандатах: члены і кандыдаты горсовета, члены ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ, члены ЦВК і СНК, упаўнаважаныя Камісіі партыйнага кантроля, Камісіі совецкага кантроля, члены бюро ГК КП(б)Б і оргбюро райкомаў КП(б)Б, члены бюро ГК ЛКСМБ і оргбюро райкомаў ЛКСМБ і члены прэзідыума ЦСПСБ. Астатнія праходзяць па спецыяльных білетах, якія можна атрымаць у горсовеце (пакой № 49, 3 паверх) з 9 да 4 гадзін дня і з 6 да 10 гадзін вечара з 20 студзеня 1936 года.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

БАЛБАТНЯ ЗАМЕСТ БОЛЬШЭВІЦКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ГАРУЧАЕ

Дырэктар Чырвонапольскай МТС т. Іозет у гутарцы з нашым карэспандэнтам паведаміў, што магутнасць трактарнага парку Чырвонапольскай МТС у гэтым годзе павялічваецца ў тры разы. Да вясны МТС будзе мець 50 трактараў, у тым ліку пяць чэлябінцаў. У сувязі з гэтым значна ўзрастае патрэбнасць у гаручым. Справа ўскладняецца тым, што Чырвонаполле знаходзіцца на адлегласці 60 кілометраў ад чыгункі. Гаручае прыходзіцца вазіць з касцюковіцкага нафтасклада. Калі гаручае не будзе вывезена на працягу студзеня—лютага, МТС можа апынуцца напярэдадні сяўбы ў надзвычайна цяжкім становішчы.

Як-жа стаіць справа з вывазкай гаручага зараз? У студзені МТС павінна была забраць са склада 23 тоны, вывезена-ж 22 тоны. Усяго трэба вывезці 180 тон, але МТС мае тары толькі на 50 тон.

Дырэктар запаўніў, што можна яшчэ пры мабілізацыі ўсіх мясцовых рэсурсаў выявіць тару на месцы. Але гэтага хопіць яшчэ на 15—20 тон.

На месцы можна ў патрэбна мабілізаваць значна большую колькасць тары. Для гэтага патрэбна толькі настойлівая, крапатлівая работа. Відаць, што мясцовыя арганізацыі, райком партыі і дырэктар МТС бяздзейнічаюць у справе забеспячэння трактарнага парка гаручым. Сакратар райкома партыі, дырэктар МТС персанально адказваюць за гэту справу. Яны павінны неадкладна прыняць меры, каб забяспечыць бесперабойную і своечасовую дастаўку гаручага ў Чырвонапольскую МТС.

ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА ВЫВАЗКІ ГАРУЧАГА Ў СМАЛЯВІЧАХ

Наш супрацоўнік меў па тэлефону гутарку са старшым агранамам СМАЛЯВІЦКАЙ МТС тав. Станчанка аб прычынах, чаму МТС не выбірае гаручага са складаў нафтазбыту.

МТС поўнасцю забяспечана тарай і ў размерах больш чым трэба для задаваленння сваіх патрэб. МТС мае сваёй тары на 20 тон гаручага. Ёсць таксама магчымасць размясціць 60—70 тон на складах райсаюза. Але тым не менш за студзень месяц МТС не забрала са складу ні адной тоны.

— Справа ў тым, — тлумачыць тав. Станчанка, — што ў нас няма сродкаў. Калгасы нам вінаваты 20.000 рублёў. Калі паступяць грошы, пачнем гаручае выбіраць.

— А калі гэта будзе?

— Вось якраз гэтага я вам не магу адказаць, бо гэтага не ведае і дырэктар МТС т. Басальга.

Становішча ў МТС з выбаркай гаручага пагражаючае. Для пасеўнай 1936 года МТС яшчэ не мае ні адной тоны. Але гэта, відаць, мала цікавіць і сакратара райкома КП(б)Б т. Кудмана і старшыню райвыканкома т. Хадарыевіча. Нафтасклады перапоўнены, гаручае дзяваць няма куды, а МТС, якая мае даволі пустой тары, свайго гаручага не забірае.

ПАВЕДАМЛЕННІ

23 студзеня 1936 г. у 7 гадзін вечара ў памяшканні клуба VII з'езда прафсаюзаў (рог Комуністычнай і Энгельса) адбудзецца **сход партактывы Варашылаўскага раёна.**

Сакратары парткомаў павінны атрымаць білеты ў райкоме КП(б)Б (пакой № 5).

Оргбюро Варашылаўскага горрайкома КП(б)Б.

21 студзеня 1936 г. у 10 гадзін раніцы ў памяшканні Белдзяржкіно (Совецкая, 70) адбудзецца **нарада сакратароў парткомаў і парторгаў Варашылаўскага раёна.**

Оргбюро Варашылаўскага РК КП(б)Б.

Адказ на культуры і прапаганды ленінізма Менгаркома КП(б)Б прапануе ўсім прапагандыстам, якія атрымліваюць літаратуру па выпісцы гаркома, унесці грошы за выпісанымі ім газеты «Правда» і «Звязда» да 25 студзеня г. г.

Грошы прымаюцца ў Менгарбюро Саюздрука (К. Маркса, 10/90) да 8 гадзін вечара.

Не ўнёсшым грошы да гэтага часа выпіска газеты «Правда» з 1 лютага г. г. будзе спынена.

Культпроп Менгаркома КП(б)Б

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Хісткае становішча габінета Лаваля

ПАРЫЖ, 17 студзеня. На пасяджэнні палаты дэпутатаў 16 студзеня пасля ўступнай прамовы старшыні палаты Буісона былі агалошаны пастуціўшыя ў палату запросы. Лаваль ад імя ўрада прапанаваў адкласці ўсе запросы аб агульнай палітыцы ўрада і абгаварыць толькі пытанне аб дапамозе сельскай гаспадарцы.

Урад, паставіўшы пытанне аб давер'і, атрымаў у парламенце большасць у 315 галасоў супроць 252. Аднак, не гледзячы на гэта, магчымасць міністэрскага крызісу не знішчана. Пасля галасавання ў палаце, міністры-радыкалы сабраліся на нараду ў міністэрстве гандлёвага флота. Эрыё заявіў, што ён мае намер падаць у адстаўку. Яго пункт гледжання падзялялі міністр гандлю Боне і міністр гандлёвага флота Бертран.

Пасля агалашэння рэзультатаў галасавання, дэпутат Лоран паставіў урыду пытанне аб тэрміне ратыфікацыі франка-совецкага пакта. Лаваль ад імя ўрада абвясціў, што ратыфікацыя франка-совецкага пакта будзе пастаўлена ў парадак дня палаты пасля звароту Лаваля з Жэневы.

***

ПАРЫЖ, 18 студзеня. (БЕЛТА). На пасяджэнні членаў парламенцкай фракцыі радыкалаў, галасаваўшых 16 студзеня супроць выражэння давер'я ўраду, прынята рэзалюцыя, якая канстэтуе, што большасць членаў партыі радыкалаў лічыць, што прабыванне міністраў-радыкалаў ва ўрадзе Лаваля несумяшчальна з дактрынай партыі. Гэта рашэнне было даведзена да ведама Эрыо дэлегацыяй, вылучанай сходам. Эрыо ў адказ на гэта рашэнне ўказаў, што ён даўно ўжо прыняў рашэнне выйсці ў адстаўку.

Як паведамляе агенцтва Гавас, Эрыо заявіў, што падасць у адстаўку на працягу 48 гадзін.

ПАМЕР САКЛАТВАЛА

ЛОНДАН. 18 студзеня. Памёр Саклатвала, былы комуністычны дэпутат парламента ад Лондана ў 1922—23 і ў 1924—29 гг.

Саклатвала — віднейшы індыйскі комуніст, адзін з самых папулярных работнікаў англійскай комуністычнай партыі — нарадзіўся ў 1874 годзе ў Індыі. Ён аснаваў «лігу абароны індыйскіх рабочых» у Англіі.

ЛОНДАН, 18 студзеня. (БЕЛТА). Крэмацыя памёршага ўчора віднейшага індыйскага комуніста Саклатвала адбудзецца 20 студзеня. Рад відных дзеячоў англійскага рабочага руху прыслаў органу компартыі «Дэйлі уоркер» выказванне спачування.

Вайна ў Абісініі

НАСТУПЛЕННЕ ІТАЛЬЯНСКІХ ВОЙСК НА ПРАВІНЦЫЮ СІДАМО

АДЫС-АБЕБА, 19 студзеня. (БЕЛТА). Пазаўчора італьянцы пачалі падрыхтаваныя імі наступальныя аперацыі ў новым напрамку — на правінцыю Сідамо (паўднёвы фронт). Моцная група атакавала слабае авангардзнае прыкрыццё абісінцаў удоўж ракі Ганале-Дорыя. Пасля кароткай сутычкі абісінцы адышлі на поўнач за пункт Малка—Ладзір. Італьянскія часці прадаўжаюць прасоўвацца на паўночны захад, не пакідаючы даліны ракі.

Апублікаванае 18 студзеня абісінскае паведамленне адмаўляе факт адыходу абісінцаў у раёне Ганале—Дорыя, тлумачачы перасоўванні абісінскіх часцей у гэтым раёне жаданнем услізнуць з пад удараў італьянскай авіяцыі. Поспех італьянскіх войск на гэтым участку, аднак, несумненны. Да падыходу буйных сіл раса Дэста з тылавых раёнаў італьянцы маюць поўную магчымасць прасоўвацца на поўнач.

Рубеж Уал-Уала па-ранейшаму застаецца ў руках італьянцаў.

ЯПОНСКАЯ АГРЭСІЯ Ў КІТАІ

УНУТРАНАЯ МАНГОЛІЯ— „НЕЗАЛЕЖНАЯ ДЗЯРЖАВА“

БЕЙПІН, 19 студзеня. (БЕЛТА). Намеснік старшыні палітычнага совета Унутраной Манголіі князь дэ Ван у цыркулярнай тэлеграме абвясціў аб стварэнні новай мангольскай дзяржавы «Менгу-Го». Гэта тэлеграма, паводле слоў газет, два дні затрымлівалася ўрадавым тэлеграфам. Тэлеграма падпісана таксама Цзо Шы-хаям, камандуючым так званымі мангольскімі войскамі, арганізаванымі японскім камандаваннем у Манчжоу-Го.

Рух па чыгунцы Бейпін-Суйюань амаль спыніўся. Кітайскае ваеннае камандаванне правінцыі Суйюань і Шаньсі сцягвае войскі для падрыхтоўкі абароны. Войскі вядомага японскага агента Лі Шоу-сіна захапілі на поўнач ад Калгана стратэгічны пункт Дацзінмынь. Войскі чахарскага правінцыяльнага ўрада адступаюць без супраціўлення к Калгану.

***

ЛОНДАН, 18 студзеня. (БЕЛТА). Бейпінскі карэспандэнт «Дэйлі геральд» паведамляе, што дэ Ван абвясціў «незалежнасць» Унутраной Манголіі, якая, падкрэслівае карэспандэнт, «будзе кіравацца з Токіо». Карэспандэнт паведамляе аб узмацненні японскіх і манчжурскіх войск ва Унутраной Манголіі. Урад Манчжоу-Го падарыў дэ Вану самалёт у асабістае карыстанне і абяцаў яму ўсебаковае ваеннае падтрымане ў выпадку нападу нанкінскіх войск.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 | Сёння, 20 студзеня, **ПЛАТОН КРЭЧЭТ** Пачатак у 8 г. веч. Білеты прадаюцца ў касе тэатра.

Пам. клуба МЕТАЛІСТАЎ (вул. Кірава, 12, тэл. 25-384) | Спектаклі смаленскага абласнога тэатра **музкамедыі** Сёння, 20 студзеня, (пастаянныя карткі №№ 36 і 37) **„ЦЫГАНСКАЯ ЛЮБОВЬ“** Пачатак роўна ў 8 гадзін вечара. Каса адкрыта з 12—2 гадз. і з 5 гадз. вечара.

Гукавы кінотэатр „Чырвоная зорка“ | Мастацкая кінакамедыя **Мяч і сэрца**

ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «ПРОЛЕТАРЫЙ» | Амерык. гукавы фільм **Чалавек-невідзімка**

Кіно «СПАРТАК» | Усходні мастацкі фільм **НАТЭЛА** (Нявольніцы гарэма)

Бюро шахматна-шашачнай секцыі ЦСПСБ з жалем паведамляе аб смерці старэйшага шахматыста БССР

Антона Антоновіча КАСПЕРСКАГА

і выказвае спачуванне яго сям'і.

Пахаванне адбудзецца сёння, 20 студзеня, у 4 гадзіны дня. Вынас цела з нервовай клінікі (вуліца імя Валадарскага).

НА ДНЯХ! Гукавы кінотэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ НА ДНЯХ!

ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ПАДРУГІ

ДНЕПРА-ДЗВІНСКАЕ РЭЧНАЕ ПАРАХОДСТВА

ПРАПАНУЕ

грузаадправіцелям, якія зацікаўлены ў транспартаванні грузаў па воднаму або змешанаму чыгунчна-воднаму транспарту ў НАВІГАЦЫЮ 1936 г.,

даць свае ЗАЯВКІ НА ПЕРАВОЗКУ ГРУЗАЎ

да 25 студзеня 1936 года і заключыць адпаведны **дагавор.**

У заяўках павінны быць указаны: род груза, пункты адпраўлення і назначэння, якой хуткасцю, аб'ём перавозак (у тонах) за навігацыю з выдзяленнем перавозак на першыя тры месяцы памесячна.

Дагавор заключаецца па перавозках па ўсіх рэках басейна кіраўніцтвам параходства **(гор. Гомель, вул. Арцёма, 17),** мясцовымі адпаведнымі начальнікамі прыстаней.

Кіраўніцтва ДДРП, Гомель.

На падставе пастановы СНК БССР ад 16 снежня 1935 г. (пратакол пасяджэння № 29),

віцебская лабараторыя „Зара“

РЭАРГАНІЗУЕЦЦА.

Усе ўстановы, арганізацыі і прыватныя асобы, якія маюць да лабараторыі «Зара» якія-небудзь прэтэнзіі, павінны не позней 1 лютага 1936 г. накіраваць іх ліквідкому лабараторыі (Віцебск, Ільінская).

Пасля ўказанага тэрміну, прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

Кантора МАЛЯРБУДА (пры Белпромбудтрэсце)

прымае заказы па ўсёй Беларусі на розныя **масляныя, клеявыя, пабелачныя работы, роспіс паталкоў і сцен,** і іншыя аліфарбяныя работы.

АДРАС: **Менск, Рэвалюцыйная, 3, Малярбуд.**

ГРАМАДСКІ УНІВЕРСІТЭТ БелНІТО СОЦЗЕМЛЯРОБСТВА

(Комсамольская, 26, Дом тэхнікі, тэл. 25-649).

Сёння, **20 студзеня,** у 7 гадзін вечара, адбудзецца

ДАКЛАД СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ВОПЫТНІКАЎ:

тав. **РУТКОЎСКАГА, БАРОЗДЗІЧА, ПРОЦКАГА** і інш. аб іх дасягненнях у выведзенні новых культур (вінаграду і інш.) у БССР.

Запрашаюцца ўсе зацікаўленыя гэтым пытаннем.

БЕЛ. НІТО СЕЦЗЕМЛЯРОБСТВА.

На падставе загаду ОРС Галоўдартранса НКУС БССР,

менская база ОРС'а Галоўдартранса

з 15 студзеня 1936 года **ЛІКВІДУЕЦЦА.**

Арганізацыі і асобы, якія маюць прэтэнзіі да базы ОРС ГДТ, павінны прад'явіць іх да 1 лютага 1936 года ліквідкому базы ОРС ГДТ па адрасу: **Свярдлоўская, 45.**

Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

Адміністрацыя і МК Дзяржаўнага выдавецтва БССР выражаюць глыбокае спачуванне

КАСПЕРСКАЙ Ніне Антонаўне

з прычыны смерці яе

БАЦЬКІ.

Рэдакцыя, мясцком і калектыў супрацоўнікаў «Звязды» з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці загадчыка шахматнага аддзела «Звязды» тав. А. КАСПЕРСКАГА і выказваюць сваё спачуванне сям'і нябожчыка.

У аддзел аб'яў звяніце па тэл. № 21-351

Уп. Галоўлітбала № Г—4622. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Тыраж 106.045.